Рэклама была складзена настолькі пераканаўча, а газеты-рэкламадаўцы былі настолькі салідныя, што я, каюся, грэшны, паддаўся спакусе і паслаў патрэбныя звесткі (зрэшты, яны настолькі агульныя, што фірма лёгка магла б атрымаць іх і іншым шляхам). Неўзабаве прыйшоў адказ (з яго я зразумеў, што звесткі пра мяне ўведзены ў камп'ютэр). А з ім і "кішэнны" талісман, і "ліст" ад самой М.Дзюваль, які пачынаўся словамі: "Вскрыв Ваш конверт, я почувствовала какой-то странный флюид, исходящий из Вашего послания. У меня было очень четкое видение, что в течение ряда ближайших лет и даже месяцев Вы познаете период Удачи, которого Вы никогда не знали". І гэтак далей, і гэтак далей на чатырох старонках трафарэтнага друкаванага тэксту.

А затым, як кажуць, і пайшло і паехала. Ледзь не кожны дзень (камп'ютэр працаваў...) я атрымоўваў усё новыя спакуслівыя прапановы за нейкіх 778000 руб. (або нават з літасцівай скідкай напалавіну) атрымаць сваё індывідуальнае прадказанне-гараскоп. За такія ж немалыя грошы — нейкія няпэўныя кнігі, удзел у "Вялікай Гульні", дзе прызамі меліся выступаць "Фольксвагены-Гольфы", пярсцёнкі з "сапраўдным брыльянтам", тэлевізары "Самсунг" і шмат што іншае. Мадам Дзюваль трывожылася, чаму я не паспяшаю насустрач свайму шчасцю, чаму не шлю грошы. "Я спрашиваю себя, — пыталася яна, — получили ли вы Талисман удачи, который я по вашей просьбе недавно отправила?" Як бачыць чытач, вялікая літара ў ранейшым звароце цяпер была зменена на малую: маўляў, ты цяпер свой чалавек, увайшоў у гульню — і няма чаго з табою цырымоніцца.

Аднак я не адказваў на чарговыя пасланні мадам Дзюваль і ўсіх тых, хто стаяў за ёй (а, магчыма, і выкарыстоўваў яе прозвішча) у Мінску, не таму, што мяне пакрыўдзіў менш пачцівы зварот. Я ў гэты час пісаў ліст у ЗП "Пакупкі на дом", тэкст якога прыводжу ніжэй у перакладзе з рускай (мадам Дзюваль жыве ўсё ж у Францыі, і беларускі тэкст ёй маглі не ператлумачыць...) на беларускую мову:

"Каля двух месяцаў я вагаўся: ці абнародаваць тое, што здарылася са мной пасля атрымання "талісмана М.Дзюваль", ці аддаць усё забыццю, палічыўшы выпадковым супадзеннем падзей. Раіўся са святарамі, філосафамі. А аднойчы ў аўтарытэтным коле гэтае пытанне было вынесена на спецыяльнае абмеркаванне. І мае субяседнікі былі аднадушны: трэба біць трывогу. Таму што тое, што здарылася са мною, хто парушыў пасля атрымання талісмана **першую запаведзь**, можа здарыцца і з другімі.

Аднак па парадку. Як чалавек, што мае некаторае дачыненне да журналістыкі і рэкламы, павінен сказаць, што Ваша рэклама складзена прафесійна, пераканаўча з псіхалагічнага пункту гледжання. Мяне, у прыватнасці, як верніка пераканала тое, што пані Дзюваль была прынята Папам Рымскім, а яе дзеянні нібыта былі прызнаны богакарысным і (хаця пазней падумалася: а я ж таксама ў свой час быў прыняты Папам Рымскім, але гэта зусім не можа служыць доказам маёй безграхоўнасці).

Адным словам, рэклама пераканала мяне. Я напісаў Вам ліст. Неўзабаве атрымаў абяцаны талісман і, не вельмі разглядваючы яго, 8 красавіка гэтага года (тут буду дакладным) каля абеда ў прысутнасці сваіх калег паклаў яго ў кішэню. І адразу ж прыйшлі дзве дрэнныя фінансавыя весткі, якія датычыліся як мяне, так і нашага калектыву... Вечарам пачаўся перадінфарктны стан. Давялося выклікаць "хуткую дапамогу", што і было зафіксавана ў бюлетэні (ксеракопію яго прыкладаю).

Лежачы на ложку, я раздумваў, адкуль раптам прыйшла "чорная паласа". Кардыяграмы і вынікі вымярэння ціску 9-га і 10-га былі ўсё горш і горш. Нарэшце 11-га дастаў талісман і пачаў яго разглядваць. Аказалася, на ім **не было хрысціянскай сімволікі**, выява была, у лепшым выпадку, язычніцкай. І тут да мяне дайшло: ды я ж парушыў першую біблейскую запаведзь — "Не мей іншых бостваў, апрача мяне", гэта значыць Бога!

Выцягнуты з кішэні талісман застаўся на стале. І вынікі далі сябе адчуць адразу. Назаўтра да доктара я змог дабрацца самастойна, ціск знізіўся, кардыяграма стала лепшай (хаця да нормы далёка і цяпер). У наступныя дні нечакана вырашыліся і фінансавыя справы.

Мяркуючы, што тут мог адбыцца і выпадковы збег акалічнасцей, праз некаторы час я паўтарыў "эксперымент". І зноў той жа вынік... Значыць, калі парушаеш Боскую запаведзь, непазбежна пачынае дзейнічаць супрацьлеглая сіла!

Вось чаму вяртаю талісман. Вядома, як чалавек, што панёс фізічную, маральную і матэрыяльную шкоду, я мог бы запатрабаваць ад Вас (і магчыма, запатрабую) кампенсацыю. Але справа не столькі ў мне, колькі ў іншых даверлівых людзях, якія могуць быць пакараны Госпадам за парушэнне той жа запаведзі. Таму я патрабую, каб Вы "адклікалі" разасланыя Вамі талісманы праз тыя ж СМІ, якія змясцілі Вашу рэкламу. У супрацьлеглым выпадку я буду **вымушаны абнародаваць** дадзены ліст, як папярэджанне іншым: не давярайце ідалам.

І, вядома ж, я адмаўляюся прыняць удзел у Вашай "Вялікай Гульні".

Працытаваны ліст у той жа дзень быў адпраўлены заказным лістом па ўказаным адрасе...

Чытач ужо, відаць, здагадваецца: так, адказу няма і да сённяшняга дня. Перастаўшы яго чакаць, я вырашыў пазваніць шаноўнаму Замежнаму прадпрыемству: вымушаны апублікаваць ліст. Але па 09 мне адказалі: "Такая контора у нас не числится".

Выпадак другі. Здарыўся ён ужо не столькі са мной, колькі з маім земляком, жыхаром вёскі Палушы Астравецкага раёна Баляславам Вішнеўскім. Дзесьці ён вычытаў рэкламу акцыянернага таварыства (каб нешта не пераблытаць, дадзім назву па-руску) "Специализированный инвестиционный фонд, аккумулирующий именные приватизационные чеки "Имущество", "Атлант-М-Инвест" і ўклаў у яго свае сціплыя капіталы. Спачатку прыйшлі нават нейкія дывідэнды. Але потым усе сувязі абарваліся. Баляслаў Вішнеўскі званіў па ўказаным раней тэлефоне ў Мінск, аднак адтуль адказвалі, што такога таварыства там ужо няма, а іншага тэлефона яны не ведаюць. Тады падмануты зямляк звярнуўся да мяне: табе ж лягчэй адшукаць сляды, жывучы ў Мінску... Пачаў званіць, шукаць. І заўсёды мяне адсылалі на вядомы завод халадзільнікаў "Атлант". Ды там толькі разводзілі рукамі: няма і не было ў нас такога акцыянернага таварыства, ведаць не ведаем, хто выкарыстаў наша імя (падумалася: ведаюць жа, да чыйго імя прысуседзьвацца).

Зняверыўшыся ў пошуках, я спыніў іх. Паведаміў земляку: плакалі твае грошыкі... І раптам на I з'ездзе настаўнікаў Беларусі чую: слова прадастаўляецца прэзідэнту акцыянернага таварыства "Атлант-інвест" Леаніду Іванавічу Калугіну. Прамова яго ажно расчуліла мяне — настолькі праваслаўная, настолькі хрысціянская, настолькі насычаная палымянымі заклікамі жыць па маралі, што ў мяне ўспыхнула надзея: вернуцца грошы майму земляку! Не можа быць, каб і Леанід Іванавіч не ведаў, хто выкарыстаў назву яго знакамітага прадпрыемства. Аднак спробы ў перапынку адшукаць прамоўцу скончыліся нічым. Спробы зноў звязацца па тэлефоне — таксама ("по справке не проходит"). Аднак у гэтым выпадку ў мяне ўсё ж цепліцца вера: ну не можа чалавек, які заклікае да маральнасці іншых, ашукаць кліента. Можа, прачытаюць гэты артыкул засакрэчаныя кіраўнікі вышэйназванага фонду, успомняць, што на Гродзеншчыне жыве чалавек (і, відаць, не адзін), які даверыў яму свае грошы. Дарэчы, калі верыць дагаворупасведчанню, то яго прэзідэнтам з'яўляўся нехта Андрэй Будчанка.

Што ж агульнага ў гэтых двух выпадках? Агульнае, відаць, тое, што прадпрымальнік і кліент тут пастаўлены ў няроўныя ўмовы. Адзін — засакрэчаны. І пошукі яго нагадваюць лоўлю чорнага ката ў чорным пакоі (да таго ж узнікае ўражанне, што "кот", атрымаўшы грошы, своечасова знікае з поля зроку). А другі — кліент — навідавоку, але безабаронны.

Безабаронны? А чаму? Нехта ж рэгіструе такія прадпрыемствы і таварыствы. Нехта ж пагаджаецца з іх назвамі, юрыдычным адрасам. А потым гэты "нехта" падводзіць найперш дзяржаву. Бо Баляслаў Вішнеўскі, які галасаваў за нашага цяперашняга прэзідэнта і ганарыцца гэтым, цяпер ужо разняверыўся ва ўсіх і ва ўсім на свеце. І галоўнае, ён, як чалавек рэлігійны, пачынае сумнявацца, ці ёсць на зямлі Боская справядлівасць.

Адам МАЛЬДЗІС.

А.Міласэрдны стаў заслужаным

За значны ўклад у развіццё станкабудавання, шматгадовую плённую працу ў гэтай галіне дырэктару Аршанскага станкабудаўнічага завода "Чырвоны барацьбіт" Анатолю Кірылавічу Міласэрднаму прысвоена ганаровае званне "Заслужаны работнік прамысловасці Рэспублікі Беларусь".

Указ аб гэтым прэзідэнт Рэспублікі Беларусь падпісаў 24 лістапада 1997 года.

БелТА.

Стоп-кадр

После затяжного капитального ремонта в Витебске открылись ясли-сад №53, принявшие 120 мальчиков и девочек.

На снимке: *воспитанники яслей-сада №53.*

Фото Александра ХИТРОВА, БелТА.

Крымінал

"Сеанс адначасовай гульні" не ўдаўся і ў Оршы

Не толькі бессмяротным героям Ільфа і Пятрова, але і заезджым "гастралёрам" з Гомеля і Сімферопаля не ўдалася задуманая аперацыя па лёгкім, але незаконным абагачэнні. 21 лістапада з 11 да 17 гадзін чацвёра махляроў змаглі атрымаць у чатырох магазінах Оршы халадзільнік, пыласос, 4 тэлевізары, мяккі вугал, шпалеры, дрылі, свяцільні і іншыя таварна-матэрыяльныя каштоўнасці на суму звыш 150 мільёнаў рублёў. Адміністрацыі магазінаў яны прад'явілі падробленыя плацёжныя даручэнні і даверанасці.

Але калі нават добра арганізаваным злачынствам проціпастаўлены арганізаваныя дзеянні праваахоўных органаў, вынікі прадказальныя. Так здарылася і на гэты раз. Прадстаўнікі Гомельскага УУС дзейнічалі разам з оперупаўнаважанымі па барацьбе з эканамічнымі злачынствамі і супрацоўнікамі аршанскага аб'яднання "Ахова", аператыўна выявілі і затрымалі махляроў.

Брата ацанілі ў 2500 долараў

У Віцебскае ўпраўленне рэспубліканскага Камітэта па арганізаванай злачыннасці і карупцыі звярнуўся мясцовы жыхар, які паведаміў жахлівы факт. Некалькі дзён таму невядомыя ўкралі яго 28-гадовага брата, які нідзе не працуе, раней судзімы, і запатрабавалі 2500 долараў выкупу, пагражаючы фізічнай расправай у выпадку, калі ён адмовіцца выканаць іх умовы.

22 лістапада ўдалося затрымаць двух жыхароў Віцебска і прыгарада, мужчын 44 і 34 гадоў, адзін з іх нідзе не працуе, якія падазраюцца ў злачынстве. Адзін з іх пры затрыманні аказаў актыўнае супраціўленне, паспрабаваўшы адабраць пісталет у работніка міліцыі. Месцазнаходжанне маладога чалавека пакуль не ўстаноўлена.

Вольга СІДАРОВІЧ, БелТА.

Віцебск.

Храм адчыняе дзверы

Першае богаслужэнне адбылося на днях ў новым касцёле, які ўрачыста адкрыўся ў вёсцы Азёры Гродзенскага раёна. Пабудаваны ён на ахвяраванні прыхаджан з дапамогай мясцовага калгаса і зверагаспадаркі. Асвяціў касцёл біскуп Аляксандр Кашкевіч. Ганаровым госцем урачыстасцей быў генеральны консул Рэспублікі Польшча ў Гродне Сільвестар Шостак.

Цікава, што закладзены некалькі гадоў таму ў фундамент храма камень быў асвечаны папам рымскім Іаанам Паўлам ІІ і дастаўлены на будоўлю з Польшчы.

На ўкраінска-беларускай мяжы знойдзены кантрабандны рубідый

Супрацоўнікі ўпраўлення Службы бяспекі Украіны ў Ровенскай вобласці разам з мясцовымі мытнікамі затрымалі на ўкраінска-беларускай мяжы двух грамадзян адной з суседніх дзяржаў, у якіх канфіскавана шкляная капсула з серабрыста-белым рэчывам.

У канфіскаванай капсуле знаходзілася 50 грамаў рубідыю-87, кожны грам якога каштуе ад 1,5 да 2 тысяч долараў. Рубідый можна атрымаць толькі ў лабараторных умовах, ён выкарыстоўваецца для вытворчасці катодаў фотаэлементаў, газаразрадных лямпаў спецыяльнага прызначэння, для спецсплаваў у ядзернай, хімічнай і ракетнай прамысловасцях.

Фінансы

Нацыянальны банк абавязаў банкі прадаць сродкі ў замежнай валюце

Нацыянальны банк накіраваў у камерцыйныя банкі ліст з тлумачэннямі парадку абавязковага продажу імі сродкаў у замежнай валюце ў адпаведнасці з нядаўняй пастановай Савета дырэктараў.

Нацбанк, у прыватнасці, паведамляе, што разлік агульнай сумы, якая падлягае абавязковаму продажу банкам, трэба рабіць шляхам вызначэння розніцы паміж даходамі, атрыманымі ў замежнай валюце па ўсіх аперацыях банка, і расходамі, панесенымі ў замежнай валюце па асноўных банкаўскіх аперацыях. Абавязковы продаж упаўнаважанымі банкамі сродкаў у свабодна канверсаванай валюце і расійскіх рублях можа рабіцца, згодна з тлумачэннем, у адной з валют, якая каціруецца на Міжбанкаўскай валютнай біржы, акрамя ўкраінскіх грыўнаў. Разлік сумы абавязковага продажу па ўказаным прынцыпе робіцца па афіцыйным курсе Нацбанка на апошнюю лічбу справаздачнага месяца; абавязковы продаж праводзіцца галаўным банкам не пазней за 5-ую лічбу месяца, наступнага за справаздачным.

Як адзначаецца ў лісце, залішне прададзеная банкам замежная валюта ў залік патрабуемых у далейшым продаж на Міжбанкаўскай валютнай біржы не прымаецца.

Ягор ЗВОННІКАЎ, БелаПАН.

Народная Воля
27 ЛІСТАПАДА 1997 г.

Дайджест

Жертва преступления "решает"... судьбу преступника. По "горячей линии"

Жители Нью-Йорка, ставшие жертвами преступлений, теперь смогут принимать непосредственно участие в дальнейшей судьбе своего обидчика, пишет "Лос-Анджелес Таймс". Для этого власти города открыли "горячую линию", где пострадавший получит всю интересующую его информацию о преступнике, в том числе в какой тюрьме последний отсидит свой срок и когда будет выпущен на свободу. Кроме того, по информации газеты, жертва преступления имеет право сама назначить меру наказания своему обидчику и даже ходатайствовать о его освобождении.

Сингл Элтона Джона в Книге рекордов Гиннеса

Сингл Элтона Джона "Свеча на ветру", посвященный памяти трагически погибшей принцессы Дианы, побил все существующие рекорды и официально зарегистрирован в Книге рекордов Гиннеса как самая продаваемая песня, сообщает британская "Таймс". По информации газеты, за 37 дней было продано почти 32 миллиона экземпляров. На протяжении последних 55 лет рекордсменом в этой области был Бинг Кросби с синглом "Белое Рождество". Пластинка с этой песней была продана в количестве тридцать миллионов экземпляров. Газета также отмечает, что Элтон Джон намерен отдать всю прибыль от проданных в Великобритании экземпляров "Свечи на ветру", а это приблизительно двадцать миллионов фунтов стерлингов, в Фонд памяти принцессы Дианы. В целом, по прогнозам экспертов, "Свеча на ветру" принесет Элтону Джону более ста миллионов фунтов стерлингов.

Семь миллионов безработных французов. По данным статистики, а не правительства

Французские социалисты, которые победили на выборах в июне под лозунгами о ликвидации безработицы и сокращении рабочей недели до 35 часов, с нескрываемой неохотой воплощают их в жизнь, считает британская "Дейли Телеграф". Как стало известно корреспонденту газеты, французские статистисты обвинили социалистическое правительство в недостаточно внимательном отношении к проблеме безработицы в стране. По данным статистики, количество безработных составляет не три с половиной миллиона человек, как утверждает правительство, а минимум семь.

Монополия на алкогольные напитки. По всей Европе

Европейский суд подтвердил право стран — членов Европейского Союза вводить на своей территории государственную монополию на производство и продажу алкогольных напитков, сообщает агентство ДПА. В Европейский суд обращались одновременно несколько производителей алкогольной продукции, которым было запрещено продавать свои товары на территории Швеции. Своим решением, отмечает агентство, суд подтвердил, что подобного рода монополии не нарушают ничьи права, а являются прерогативой любого государства. По мнению агентства, в результате подобного судебного решения большинство стран Европейского Союза, скорее всего, также введут у себя государственные монополии на алкоголь с тем, чтобы получить дополнительные источники пополнения бюджетов.

Застой у "Тойота Мотор" в Азии. Зато перспективы в Европе

Японская компания "Тойота Мотор" не намерена делать инвестиции в государствах Юго-Восточной Азии в течение двух лет. Об этом на автосалоне в Токио объявил сегодня президент "Тойоты" Хироси Окуда. Решение японского автогиганта объясняется финансовым кризисом в регионе, в результате которого на автомобильном рынке наблюдается застой. Окуда заявил в то же время, что до конца декабря фирма определит европейскую страну, где построит новый завод. "Мы держим в поле зрения всю Европу", — подчеркнул он.

Сотрудничаешь с фирмой — вот тебе картина художника. На время контракта

Предметы искусства последнее время рассматриваются в Голландии исключительно в качестве дополнительной нагрузки к различного рода товарам и услугам. По информации агентства ДПА, большое количество голландских фирм используют картины известных живописцев для привлечения клиентов. Так, в частности, агентство сообщает, что работы великих художников можно получить в аренду на срок контракта с какой-нибудь фирмой по уборке помещений. Пока клиент сотрудничает именно с этой фирмой, в его квартире может бесплатно висеть полотно какого-нибудь известного мастера.

Подготовила Светлана РОСТОВА.

Российская Федерация

Виктор Черномырдин считает, что Россия вступила в новую стадию политической зрелости

Премьер Виктор Черномырдин утверждает, что Россия вступила в новую стадию политической зрелости. По его словам, это выражается в реальном "укреплении государства, повышении его роли во всех сферах жизни, особенно в экономике".

Выступая на коллегии МВД, премьер подчеркнул, что удалось наладить полезный диалог с оппозицией, "вставить ее в государственную систему".

По словам В.Черномырдина, государство находится в режиме роста, о чем свидетельствуют минимальная инфляция, высокие показатели сбора урожая, рост внутреннего валового продукта.

Как свидетельство прочности государства, В.Черномырдин назвал и сохранение стабильности внутреннего финансового рынка во время недавнего кризиса на мировых биржах.

Премьер сообщил, что с января будущего года правительство "выходит на устойчивый показатель роста: впервые сразу сроком на 3 года вводится валютный коридор, безболезненно проводится деноминация".

Литва

Кандидаты в президенты излагают первоочередные задачи, стоящие перед государством

Один из основных претендентов на пост президента Литвы, бывший генеральный прокурор республики Артурас Паулаускас в случае избрания его главой государства намерен сосредоточить усилия на борьбе с организованной преступностью и создании условий для развития предпринимательства в стране. Об этом он заявил по республиканскому телевидению.

Своими взглядами по поводу задач, стоящих перед главой государства, поделились в интервью телевидению и другие кандидаты в президенты Литвы.

Занимающий в предвыборных рейтингах вторую строчку (после А.Паулаускаса) американский эколог литовского происхождения Валдас Адамкус считает первоочередной задачей президента Литвы "восстановление доверия граждан к государству и человека к человеку, наведение порядка в стране".

Третий по популярности кандидат в президенты — председатель литовского сейма Витаутас Ландсбергис главной целью в случае избрания на пост главы государства видит интеграцию Литвы в ЕС и НАТО. По его мнению, в течение пяти лет, на которые избирается президент, Литва должна стать членом этих структур.

Член сейма Витянис Андрюкайтис, кандидатуру которого выдвинула оппозиционная Социал-демократическая партия, собирается в случае избрания на пост президента сменить "не менее шести плохо работающих министров", разработать и реализовать программу поддержки и защиты литовских товаропроизводителей, приостановить "безоглядную приватизацию стратегических объектов".

Еще один кандидат в президенты, член сейма Римантас Сметона в качестве приоритетного направления деятельности главы государства назвал "ускорение интеграции Литвы в НАТО и воздержание от поспешной интеграции в ЕС".

Все кандидаты в президенты за исключением В.Адамкуса оценили определенные Конституцией полномочия президента Литвы как достаточные. В.Адамкус не выразил однозначного мнения по этому вопросу.

Украина

Полет "Шаттла" с украинским астронавтом Кучма считает "только началом совместной работы" специалистов двух стран

Президент Украины Леонид Кучма заявил, что "США намерены и далее сотрудничать с Украиной в области космических технологий". Он сказал об этом в ответ на вопрос "Интерфакса" спустя несколько минут после запуска космического корабля "Колумбия" с украинским астронавтом Леонидом Каденюком на борту.

Корабль стартовал с космодрома на мысе Канаверал днем 19 ноября (в 21:46 по киевскому времени, 22:46 — по МСК).

Л.Кучма, в частности, сообщил, что руководство NASA предложило создать в Киеве украинско-американский институт, который бы занялся работой над космическими технологиями.

Молдова

Вопрос участия жителей Приднестровья в предстоящих парламентских выборах пока не решен

Президент Молдовы Петр Лучинский и лидер непризнанной ПМР Игорь Смирнов в ходе двухчасовой встречи один на один подтвердили свои прежние позиции и готовность продолжить переговорный процесс по урегулированию ситуации вокруг Приднестровья.

В заявлении для печати П.Лучинский подчеркнул, что "не следует рассматривать данную встречу как чрезвычайное событие", поскольку запланированные ежемесячные контакты не состоялись в силу ряда объективных причин.

"Мы находимся в обстановке неполного урегулирования конфликта. Но мы живем мирно, мы не собираемся воевать, конфликтовать, мы ищем подходы, которые сблизили бы наши позиции по всем проблемам, — заявил президент.

По словам И.Смирнова, на встрече был "рассмотрен широкий круг организационных вопросов, которые касаются экономического сотрудничества". "Нельзя говорить, что все решили. Главное — сблизить позиции, хотя мы сильно и не отдалялись. Идет проработка наиболее спорных проблем, по которым мы пытаемся найти скорейшее решение", — заявил он.

Для Приднестровья, подчеркнул его лидер, "очень важно получить гарантии будущего урегулирования не только со стороны стран-гарантов, но и со стороны Молдовы".

Как сообщил И.Смирнов, сторонам, в частности, удалось продвинуться в решении проблемы вывоза вооружения, которое размещено на военных складах в селе Колбасна Рыбницкого района.

Стоп-кадр

На улицах Праги.

Леонид Кучма подтверждает политическое решение о закрытии ЧАЭС при условии ввода в действие компенсирующих мощностей

Президент Украины Леонид Кучма подтвердил политическое решение о закрытии Чернобыльской АЭС к 2000 году, напомнив при этом, что Украина не сможет его реализовать без ввода в действие компенсирующих мощностей.

По оценкам Л.Кучмы, Украина затратит на ликвидацию последствий чернобыльской катастрофы до 2005 года около 600 миллионов долларов.

В ходе пресс-конференции было объявлено о сборе дополнительно 37 миллионов долларов в фонд "Укрытие", как именуется бетонный "саркофаг" над 4-м энергоблоком ЧАЭС, на котором 26 апреля 1986 года произошла авария.

Таким образом, общий объем средств, выделенных на преобразование "саркофага" в безопасную систему, составил 387 миллионов долларов, в том числе 300 миллионов долларов — средства стран "большой семерки", 50 миллионов долларов — Украины.

О направлении своих взносов в фонд на конференции объявили Дания, Финляндия, Австрия, Греция, Швеция, Нидерланды, Ирландия — по 2,5 миллиона экю каждая, а также Норвегия — 5 миллионов долларов, Швейцария — 4,6 миллиона долларов, Кувейт — 4 миллиона долларов, Испания — 3 миллиона долларов, Люксембург — 200 тысяч долларов.

Кроме того, как стало известно "ИФ" из информированных источников в Нью-Йорке, предоставить в фонд дополнительно 78 миллионов долларов намерены США.

Л.Кучма, обосновывая настоятельную необходимость сбора средств, назвал "саркофаг" "неуправляемой ядерной бомбой с часовым механизмом, время взрыва которой не может назвать никто".

По материалам "Интерфакса".

Адукацыя

У інфармацыйных сетках "Інтэрнэта" дапаможа разабрацца ААН

Пагадненне аб супрацоўніцтве паміж БДУ і Праграмай развіцця ААН /ПРААН/ падпісалі рэктар універсітэта Аляксандр Казулін і кіраўнік Прадстаўніцтва ААН у Беларусі Павел Крал.

Гэтым дакументам прадугледжваецца рэалізацыя сумеснага праекта "Інтэрнэт — БДУ", які будзе ажыццяўляцца ў рамках праграмы беларускага ўрада "Умацаванне нацыянальнай камунікацыйнай інфраструктуры ў мэтах правядзення дэмакратычных рэформ, удасканалення кіравання дзяржавай і развіцця рыначнай эканомікі". Гэты праект уключае ў сябе стварэнне ў БДУ пры фінансавай падтрымцы ААН спецыяльнага камп'ютэрнага класа, які мае выхад у сістэму "Інтэрнэт". Тут работнікі адукацыі і дзеячы навукі будуць вучыцца карыстацца глабальнай камп'ютэрнай сеткай.

Акрамя таго, падпісанае пагадненне прадугледжвае стварэнне пры Белдзяржуніверсітэце інфармацыйнага цэнтра па вывучэнню дзейнасці ААН.

Эдуард ПІВАВАР, БелТА.

Грамадская думка

Міжнацыянальных канфліктаў у Беларусі не прадбачыцца

У Беларусі няма сацыяльна-палітычнай базы для развіцця глабальных канфліктаў на міжнацыянальнай глебе. Да такога вываду прыйшлі спецыялісты Інстытута сацыяльна-палітычных даследаванняў пры Адміністрацыі прэзідэнта Беларусі пасля праведзенага вывучэння ўзаемаадносін паміж грамадзянамі розных нацыянальнасцей, якія пражываюць у нашай краіне.

У прыватнасці, даследаванне пацвердзіла, што ў рэспубліцы няма канфліктных сітуацый на этнічнай або міжнацыянальнай аснове. Аднак звыш 35 працэнтаў апытаных адзначылі, што былі сведкамі абразлівых выразаў у адрас асобы іншай нацыянальнасці або гэтыя выразы датычылі асабіста іх. Пры гэтым толькі 4,5 працэнта рэспандэнтаў зведваюць дыскрымінацыю і прыцясненні ў працоўных калектывах. З другога боку, 18 працэнтаў апытаных зведваюць пэўную непрыязнасць да прадстаўнікоў некаторых нацыянальных меншасцей, якія пражываюць у Беларусі. 12,3 працэнта рэспандэнтаў найбольш негатыўна адносяцца да чэчэнцаў, 11 працэнтаў — да азербайджанцаў, 10,4 — да армян, 7,2 — да яўрэяў і каля 6 працэнтаў — да грузінаў. На думку спецыялістаў інстытута, негатыўныя адносіны да прадстаўнікоў закаўказскіх народаў могуць стаць прычынай міжасобасных або лакальных канфліктаў. Акрамя таго, як сказалі карэспандэнту БелТА ў Інстытуце сацыяльна-палітычных даследаванняў, у час апытанняў не вывучаліся адносіны грамадзян Беларусі да нелегальных мігрантаў з краін Афра-Азіяцкага рэгіёну, якіх у нашай краіне налічваецца ад 100 да 150 тысяч. Гэта пытанне вучоныя маюць намер даследаваць у будучым годзе.

Што ж датычыць іншых аспектаў даследавання міжнацыянальных адносін у рэспубліцы, то яны даюць магчымасць меркаваць аб тым, што Беларусь — інтэрнацыянальнае грамадзянскае грамадства, паколькі каля 70 працэнтаў шлюбаў у нашай дзяржаве заключаецца з прадстаўнікамі іншых нацыянальнасцей. У працэсе даследавання таксама не выяўлена ўшчамлення правоў нацыянальных меншасцей у карыстанні нацыянальнымі культурнымі каштоўнасцямі, выбары мовы зносін, навучання і выхавання. Акрамя таго, у Беларусі няма прычын да процістаяння на міжнацыянальнай глебе, якія паслужылі б падставай для масавай міграцыі насельніцтва.

Андрэй АЛЕКСАНДРОВІЧ, БелТА.

А если подумать...

От бельгийца-водителя отцы требовали по 50 тысяч долларов за каждого погибшего малолетнего пассажира автобуса под Кобрином. Где взять бедолаге-иностранцу такие деньги?

Случай этот все лето будоражил сознание родителей: отправлять или не отправлять детей в... Европу? На оздоровление.

Трагедия она и есть трагедия. И вряд ли можно заподозрить 57-летнего водителя-иностранца в злом умысле. Вся Европа сострадает, сочувствует сегодня Беларуси, которая наиболее остро ощущает последствия катастрофы на Чернобыльской АЭС. И Бельгия — не исключение. Ее гражданин Вилли Солье, думается, также пребывал, находясь за рулем, в хорошем расположении духа, что делает доброе дело — везет белорусских детишек к себе на родину, являясь как бы послом мира между народами.

Кто жил в странах Европы или посещал их на какое-то время, наверняка знает: их дороги — не чета нашим. На автобанах (сужу в первую очередь по бывшей ГДР, где когда-то проходил службу в составе Группы советских войск в Германии) даже указатели стоят, что скорость предусмотрена... **не ниже** 90, 100 километров в час. То есть для европейцев это привычный стиль езды.

Трагический случай под Кобрином экспертиза затем объяснит превышением скорости движения и установит ее до 94 км/час. Водителя обвинят в неосторожности при управлении автобусом и виновным в превышении... Дорога-де была мокрая и т.д. Кстати, и в Бельгии, и в Польше, и в Прибалтике, отличающихся сырым, влажным климатом, это, что называется, обычный рабочий режим на дорогах. Но автокатастрофа все же произошла. И отмечена гибелью четырех детей, увечьями многих и многих маленьких пассажиров. Слов нет, горе родителей, близких вполне объяснимо. Погибших детей уже не вернешь.

Человек, которого постигло горе, становится милосерднее и к другим. Незавидной виделась и дальнейшая судьба бельгийского водителя. Новичком или малоопытным его не назовешь. И у его семьи — не меньшее горе. Трагедия приносит боль не с одной стороны — с разных. И как же белорусские семьи, пострадавшие и понесшие невосполнимые утраты, потерявшие дорогих и любимых дочек и сыновей, отнеслись к "чужому горю" в бельгийской семье?

Отцы погибших детей затребовали от 57-летнего Вилли Солье по 50 тысяч американских долларов за каждого убиенного в катастрофе. Именно такой иск они предъявили водителю через суд.

В городе Кобрин, где проходил судебный процесс над гражданином Бельгии, судья Александр Марчук признал Вилли Солье виновным в гибели четырех детей. Восемь лет он вынужден будет провести в специальной колонии, хотя при благополучном стечении обстоятельств может освободиться намного раньше. Приговор строго соответствует тяжести содеянного. Но вопрос сегодня ставится шире: в состоянии ли человек в этом возрасте заработать двести тысяч долларов? Да и по европейским понятиям это — ну, оч-ч-ень солидная сумма.

По нашим доморощенным законам, все еще хранящим определенные нормы и каноны нравственности, "суровый материализм" отсутствует напрочь. Можно взыскать деньги с автопредприятия или фирмы, которую представляет водитель. А поскольку между Бельгией и Беларусью нет не просто договора о правовом сотрудничестве, а даже малейшего намека на правовую взаимность, взыскать желанную сумму с водителя автобуса и его фирмы не удалось.

Почеловечнее оказалась страховая компания, в которой в свое время застраховался бельгийский водитель от несчастного случая. Она безоговорочно выплатила 80 тысяч долларов компенсации семьям погибших и пострадавших, не забыв, разумеется, и близких Вилли Солье.

На многие размышления, "новые" мысли наталкивает подобный иск. Почему так быстро мы становимся прагматиками-материалистами, весьма практичными людьми? Неужели ушедшего из жизни близкого человека можно компенсировать тысячами долларов? Не станут ли они поперек горла в минуты уныний и разочарований? Да и можно ли измерить миллионами рублей и тысячами дензнаков зарубежного образца человеческую жизнь? Радостно ли будет сидеть за рулем суперсовременного авто или занимать шикарные апартаменты наимоднейшего стильного коттеджа, памятуя и ведая, что приобретены они за "те самые" доллары? Тоска... А может, так думаю только я? Может, уже действительно наступили другие времена?

Виктор СВИРКО.

Духоўны скарб

Як мала мы ведаем гісторыю Бацькаўшчыны. Што можа расказаць пра такога нацыянальнага волата, як Язэп Лёсік, сённяшні выпускнік школы? А пра такіх людзей трэба ведаць кожнаму. Вось чаму "Народная воля" друкуе сёння ўспаміны Сымона Белага пра свайго дзеда .

Сымон БЕЛЫ, заслужаны настаўнік Рэспублікі Беларусь, пісьменнік

Лёс "крамольніка" з Дворнай вуліцы

Недалёка ад вёскі Мікалаеўшчына, уверх па Нёману, на ўскрайку старога хвойніка каля самага берага ракі захавалася паляна. Мясціна гэтая вельмі маляўнічая і вядомая пад агульнай назвай Клешчыцы. Тут на пачатку XX стагоддзя збіраліся сапраўдныя змагары-заступнікі нацыянальнай культуры. Яны спявалі рэвалюцыйныя песні, заклікалі народ да волі за ўласнае шчасце. Сярод настаўнікаў (а іх, рэвалюцыйна настроеных, было каля двух дзесяткаў) выдзяляліся сваякі — Язэп Лёсік і ягоны пляменнік Кастусь Міцкевіч. Да настаўнікаў далучалася вясковая моладзь, або "басотнікі", як іх грэбліва празвалі мясцовыя багацеі з суседніх паселішчаў.

Тут сур'ёзна рыхтаваліся, гуртаваліся паважлівыя, думаючыя і смелыя хлопцы, каб усёй грамадою выступіць супроць цара і яго прыслужнікаў. Пісаліся адозвы, дэкламаваліся вольналюбівыя вершы, уласныя сатырычныя песні, накіраваныя супроць існуючага ладу. Баранілі годнасць сваёй нацыі, годнасць людзьмі звацца. Дамагаліся адрадзіць духоўную памяць свайго народа. Па словах малодшага брата Якуба Коласа — Юзіка, "Мікалаеўшчына гула ў тыя часы. Дзядзька Язэп ды наш Костусь былі душою той кампаніі. Нават дзяк Зіновій Жыжейка дапамагаў ім..."

На самой справе: "бунтаўшчыкі", як пазней прызнаваўся дзяк, запрашалі на маёўкі, каб поп Гудзілоўскі мог мець свае "вушы" сярод крамольнікаў. Зіновій быў доўгі, як жэрдка. На хударлявым, з доўгім носам твары блукала прыязная смяшынка. Рэдкая і доўгая казліная барода з палоскай пшанічнай аўчынкі вусоў аздабляла лысаватую, крыху акантаваную галаву памочніка папа. Голас меў нізкі і басісты і слых музыкальны, адмысловы. Настаўнікі не цураліся яго. Часам жартавалі. Дзяк насіў галошы 46-га памеру, якія латаў-пералатаў, бо ў краме нельга было купіць, заказваў ажно ў Варшаве. І да гарэлкі быў вельмі сквапны, асабліва да чужой. За "царскія слёзы", як ахрысціў яе Язэп Лёсік, дзяк не раз вазіў на сабе настаўнікаў і так іржаў, што мог пазайздросціць сапраўдны жарабец. Калі дзяк пачынаў ікаць, хлопцы ведалі: Зіновій ужо гатовы, — і дружна спявалі песню на мелодыю вядомай рэвалюцыйнай "Вихри враждебные веют над нами" і на словы Лёсіка і Міцкевіча:

Бедный дьячок наш почетный Жижейко,
Ну-ка в Клещицы марш з полбутэлькой.
"Царские слезы" во всем виноваты:
Службу в церкви забросил дьячок.
Снял он галоши, ложит заплату,
Скорбную песню про "слезы" поет...

Калі ж Жыжейка пачынаў кляваць буславым носам і салодкі сон заплюшчваў яго лупатыя, нябесныя вочы, звычайна прасіў:

— Не спявайце, хлопчыкі, бязбожныя песні, а то я часам на клірасе блытаю мелодыі. Баюся, каб не выгнаў мяне поп.

Трэба адзначыць, што Язэп Лёсік хоць быў на нейкі год з паловаю маладзейшы за свайго пляменніка, але меў станоўчы ўплыў на яго ў сэнсе заступніка нацыянальнай культуры, мовы. Яны сябравалі паміж сабою з юнацкіх гадоў. У сталыя гады сталі шчырымі абаронцамі нацыянальнай годнасці. У той неспакойны час, калі Міцкевічы жылі на Старажоўскай, або вуліцы Русецкага, іх часта можна было бачыць разам. Не будзе лішнім мовіць, што і Якуб Колас станоўча ўплываў на свайго дзядзьку ўжо як паэт, грамадскі дзеяч... А ў тую юнацкую пару, калі настаўнікі, семінарысты гукалі на поўныя грудзі ў Клешчыцах, у Ёлаве, на Прыстаньцы, Лядзінах, то самы звонкі, набатны і вольны чуўся голас Лесавіка, як часам называлі паміж сабою сябры Язэпа Лёсіка. Яго моцна паважала не толькі моладзь навакольных вёсак. Да настырнага, няўрымслівага, вольналюбівага "крамольніка" з Дворнай вуліцы хіліліся і старэйшыя аднавяскоўцы, лічачы яго сваім заступнікам. Не аднаму мікалаеўцу дапамог напісаць "прашэнне", скаргу і канкрэтна вырашыць тую або іншую сялянскую патрэбу на карысць абяздоленага. Ён быў косткаю ў горле для мясцовых чыноўнікаў, "басотнікам з вялікай дарогі", бо выкрываў іх махлярскія камбінацыі ў адносінах да цёмных, непісьменных людзей.

Так, мой дзед Язэп Лёсік нарадзіўся дзесятым у сям'і прадзеда Юркі менавіта на Дворнай вуліцы, якая злучалася з Казённай. З гэтых вуліц пачалася вёска Мікалаеўшчына. На гэтых вуліцах хадзілі сябры, на ўвесь свет вядомыя Язэп Лёсік, Кастусь Міцкевіч, Алесь Сянькевіч. У сям'і Юркі Лёсіка было сем сыноў і тры дачкі. Самая старэйшая Ганна (1857—1929 гг.) — маці Якуба Коласа. Затым загукалі на нёманскіх прасторах: Пятрусь, Міхась, Ігнат, Кацярына, Антось, Магдалена, Базыль, Павел, ну і апошні Язэп (1883—1940 гг.).

Першым настаўнікам самага малодшага стаў брат Антось. Закончыўшы Нясвіжскую семінарыю, ён прадоўжыў вучобу ў Петраградзе. Пасля атрымаў прызначэнне ў Чарнігаўскую губерню ў горад Грымяч, дзе выкладаў матэматыку ў вышэйшым пачатковым вучылішчы. Трэба адзначыць і тое, што Язэп рос у сям'і крыху распешчаным. Яму патуралі, не прымушалі ні пасвіць гусей, ні палоць на агародзе, ні кароў ганяць у поле. Як выказваўся старэйшы брат Паўлюк: "...цэлымі днямі лынды біў, гойсаючы каля Нёмана, ці лавіў яха па лесу... Але да вучобы быў здатны". Таму, магчыма, шмат даравалі малому, што добра вучыўся і быў усеагульным пестуном у вялікай сям'і Лёсікаў. Бацькі даручылі старэйшаму сыну Антосю падрыхтаваць Язэпа ў Нясвіжскую семінарыю. Ніхто не сумняваўся, што ён будзе доўжыць адукацыю там. Тут трэба агаварыцца: самы малодшы аказаўся самым заядлым беларусам. І гэта перашкодзіла яму, бо хамскую мову не паважалі ў семінарыі, а задзірысты мікалаевец не ведаў добра расейскай мовы, а, магчыма, не хацеў прыніжаць сваю родную. Ён быў не падобны да іншых абітурыентаў. Не прыжыўся Лёсік і ў Маладзечанскай семінарыі, бо і там яго погляды, крамольныя заявы паласавалі сэрца кіраўніцтва... Заклапочаны такім паваротам, бацька Юрка доўга чухаў сівую чупрыну, пагладаючы на сваю кабету Хрысціну, як бы чакаючы падтрымкі ад яе. І тут твар жонкі азарыўся светлаю ўсмешкай:

— А што, Юрка, калі нашага Язэпку забярэ з сабою Антось? Адтуль ён пойдзе ў людзі, знойдзе свой шлях. Во, я гэта і кажу, няхай Божанька спрыяе яму.

Маці як у ваду глядзела. На Чарнігаўшчыне Язэп закончыў школу, дзе працаваў ягоны брат. І з дапамогай Антося паспяхова здаў іспыты на народнага настаўніка. Адзін год нават працаваў настаўнікам рускай мовы ў сельскагаспадарчай школе ў Бабруйску. Тут ён пазнаёміўся, выпадкова, з дачкою Ядвігіна Ш. Вандай Лявіцкай, таксама настаўніцай. Пасля вакацыі Язэп Лёсік вяртаецца ў Грамяч да брата ў 1903 годзе. Вольныя ідэі, уласныя погляды на існуючы лад не прыйшліся даспадобы кіраўніцтву школы, дзе ён працаваў. Як жартаваў пазней мой дзед: "Там у Бабруйску гамоняць па-руску, калі ж я матчына слова прамовіў, дык дырэктар мяне зволіў..."

На Чарнігаўшчыне стаў актыўным членам палітычнай арганізацыі сацыял-дэмакратычнай партыі. Адкрыта выступаў супроць самадзяржаўя, заклікаў да адстаўкі ўрада, да прыходу дэмакратычных сіл, якія б кіравалі Расеяй. Чыноўнікі не засталіся ў даўгу: бунтара арыштавалі, пасадзілі на хлеб і ваду ў Ноўгарад-Северскую турму, дзе яму дазволілі падумаць пра свой будучы лёс ажно два гады. У 1907 годзе мусіў быў адбыцца суд у горадзе Старадубе над "упрямым белорусом". Аднак працэс гэты не атрымаўся, бо сам віноўнік не захацеў "предстать с повинной головою перед святейшими очами городского судьи". Лоўка зманіў старасту, што разбалеўся жывот, што трэба выбегчы на вуліцу... А там і след прастыў. Напалоханы стараста ўсё абгледзеў вакол казённага месца, папытаўся ў людзей. Давялося даць ведаць начальству. Лёсік растаў, як цукар у вадзе...

Праз колькі дзён вязень апынуўся ў Мінску. Сюды ён прыязджаў не раз. Сам высокі, статны, з прыгожым валявым тварам прыхінуўся сэрцам да дзяўчыны з крыху касавокімі вачыма, але прываблівым разумным тварам і добрым сэрцам. Кавалер не зважаў, што яго каханая робіць шырокія, мужчынскія крокі. Паланіла сэрца мікалаеўскага дзецюка незвычайная пяшчота дзяўчыны, яе адданасць беларускай ідэі. Стары Ядвігін Ш. па-бацькоўску прымаў будучага зяця, бярог яго, як роднага сына, быў не супроць, каб дачка Ванда насіла прозвішча Лёсікаў...

Абставіны вымагалі не затрымлівацца на адным месцы падоўгу. Жандары шукалі крамольнага валацугу. І родны кут нясцерпна клікаў, і хвалі Нёмана манілі ў свае абдымкі блуднага сына. Ды калі ўжо быць шчырым: там засталіся сябры і вольны дух непакоры, які трэба было шырыць, уздымаць, трэба было бараніць гонар беларусаў. На пачатку сенакоснай пары амаль з Негарэлага пехатою, па лясістых дарогах у накірунку Узды, вёскі Прусінава мерыў вёрсты роднай зямлі Язэп Лёсік. У Мікалаеўшчыне прыпыніўся ў старэйшага брата Петруся, які больш за іншых сваякоў разумеў і спагадліва ставіўся да рызыкоўнай палітычнай дзейнасці любімца бацькі Юркі. Па словах хрышчонага сына Язэпа Лёсіка, Лявона Бірулі, "Жандары ўвесь час цікавалі, пільнавалі Язэпа. Мікалаеўцы гарою стаялі за яго. Як маглі, аберагалі, хавалі, каб не арыштавалі..." І гэта чыстая праўда. Панямонцы жылі бедна, зямлі той — кот пераскочыць палоску, затое высока цанілі свабоду, волю, незалежнасць. Здарылася так: жандары выпадкова зайшлі ў хату Пятра Лёсіка, шукаючы зусім іншую асобу, а тут не дробная плотка, а шчупак трапіў у рукі ўрадніку Жураўскаму з Новага Свержана. Чыноўнік паціраў рукі ад радасці, гатовы быў пацалаваць крамольніка. Ён ужо вывеў, пад гняўлівыя погляды сям'і Пятра Лёсіка, бегляца на вуліцу і разгубіўся. Перад хатаю шчыльнаю сцяною стаялі хмурыя мужыкі, нядобра пазіраючы на блюсціцеля парадку. Іх тут было шмат. Меншая дачка Петруся паспела перадаць суседзям, што жандары злавілі дзядзьку Язэпа, "звязалі рукі, пачалі біць". Гэтая навіна маланкаю абляцела вёску...

На Дворнай вуліцы было цесна ад людзей... Язэп удзячна пакланіўся землякам, узняў лабастую галаву, сурова глянуў на ахоўніка. Той, амаль на галаву ніжэйшы за арыштаванага, баязліва аглянуўся.

— Ну што ж, васпане, цівун няўдалы! Захацеў пакаштаваць хамскіх кулакоў. У маіх землякоў яны моцныя... Паглядзі, якія ладныя дзецюкі, могуць пашчупаць урадніка бакі!.. На калені, пакуль я не перадумаў! Прасі літасці ў людзей, што ніколі не будзеш шукаць мяне і ніколі пальцам не дакранешся... А то, вунь, Нёман блізка... і сок не пацячэ.

— Так яго, так яго, царскага служаку! У каршэнь, ды няхай астыне ў рэчцы... Мо паразумнее крыху, але ж дурную галаву шапкаю не закрыеш! — несліся ядавітыя і абразлівыя выкрыкі з натоўпу.

Прыстаў Жураўскі падняў галаву і здрыгануўся: перад ім стаяў Васіль Чурак, басотнік на ўсю ваколіцу, непамернай сілы. Нібы скала ў вобразе чалавека, з суровым і страшным паглядам тыгрыных вачэй, уставіўся на ахоўніка. Халодны пот выступіў на вусатым твары — ён не чакаў спаткання з Чураком, якога пасадзіў у турму. Не забыўся пагрозы гэтага вярзілы: "Вярнуся, пап'еш нёманскай вадзічкі..." Жандар стаў на калені, стаў каяцца. Язэп адвёў руку Васіля, нізка пакланіўся людзям... Праз колькі часу ураднік Жураўскі пайшоў у адстаўку.

Гэта эпізод з вялікага жыцця Язэпа Лёсіка, яго маладосці. У хуткім часе ён надоўга развітаецца са сваім родным кутом, Бацькаўшчынай, якую любіў ахвярна, беспаваротна. Ужо ажаніўшыся з дачкой Ядвігіна Ш., ён колькі часу жыў у Мінску, але больш ездзіў па гарадах, будзіў беларускую думку, займаўся пытаннямі беларускай літаратуры, пісаў апавяданні, вершы ў газету "Наша ніва". Хоць яго творы тычыліся жыцця роднай Мікалаеўшчыны, але яны настолькі былі крамольнымі, што цэнзура ліквідавала тыражы газеты, а вышукная паліцыя бегала за аўтарам...

Цыганскае жыццё ў хуткім часе прыпынілася. Пасля двух гадоў нелегальнага жыцця на сваёй радзіме Язэп Лёсік нейкі час жыў у Пецярбургу і там бараніў беларускую ідэю, наведаў Марціна Радкевіча, сваяка Алеся Сянькевіча на Украіне. На пачатку 1911 года Язэп вырашыў наведаць брата Антося ў Ноўгарадзе-Северску. Там і арыштавалі ўцекача і далі бестэрміновую высылку ў Сібір. Па словах старэйшага брата Антося, "Язэп не ўпіраўся і не хаваўся. У ягоных вачах можна было прачытаць нейкі гонар на судзе... Ён не апраўдваўся за сваю дзейнасць, з нейкай здзеклівай усмешлівасцю гаварыў пра прагніўшы лад. З гонарам мовіў пра заўтрашні светлы дзень абяздоленых... Калі развітваўся са мною, то ўпэўнена сказаў: "Даруй, Антось, што прычыніў табе шмат клопату, а гэтыя царскія паслугачы ў хуткім часе сплывуць разам з крыгамі вясны". Я заплакаў, а яго вочы, каштанава-цёмныя, свяціліся дабрынёй і нават ахвярнасцю, а ў чорных вусах гуляла смяшынка..."

Так атрымалася па волі лёсу, што і дзядзька Язэп, і яго пляменнік Кастусь Міцкевіч сталі вязнямі царскіх турмаў. Адзін у Мінскім астрозе адбываў пакаранне па справе настаўніцкага саюза, а больш дакладна, за ўдзел у нелегальным з'ездзе настаўнікаў 1906 года. А калі ўжо шчыра, дык судзілі за рэвалюцыйную агітацыю сярод сялян, судзілі не Міцкевіча-настаўніка, а слыннага паэта, які будзіў думку, спрабаваў праліць прамень святла ў цёмную вёску, асмеліўся расправіць плечы, гукнуць на поўныя грудзі:

Я — мужык, а гонар маю,
Гнуся, але да пары.
Я маўчу, маўчу, трываю,
Але скора загукаю:
Стрэльбы, хлопчыкі, бяры!..

У Сібіры мой дзед не паў духам. Там, у Кірэнску, ён не сядзеў склаўшы рукі. Таёжныя прасторы, суровы клімат, багатая маляўнічая прырода станоўча ўплывалі на настрой і душэўную раўнавагу пасяленца. Там не адчуваў такога ўціску з боку ахоўных органаў. Прыродная кемлівасць і навука бацькі па цяслярнай справе дапамаглі вабіць вольны час і мець шчарбаты грош. Ён добрым словам успамінаў дзядзьку Антося, брата Міхала, бацьку Якуба Коласа, які прывіў любоў да тонкай, бондарскай, хвацкай прылады хатняй патрэбнасці. Лыжкі, маслабойкі, калатоўкі, таварышчы, ночвы ахвотна бралі сібіракі ад "вольнага выгнанніка з далёкай Беларусі".

У Кірэнску і ў горадзе Бадайбо рабіў пісарам, шмат чытаў, наладзіў перапіску з газетай "Наша ніва". Але як чалавек, звыклы жыць сярод прыроды, ён падоўгу затрымліваўся ў вёсках, там лячыў сваю душу ў гутарках з сялянамі, бо і яны былі такімі гаротнымі і бяспраўнымі, як яго родныя землякі. Умовы спрыялі і часу хапала для літаратурнай дзейнасці. Далёкая Бацькаўшчына паласавала сэрца на раны, і яе нескароны сын у ссылцы набліжаў светлы дзень вясны... У гэтым яму дапамагаў Алесь Гарун. Па волі лёсу змагары за лепшую долю свайго народа спаткаліся і пасябравалі ў Іркуцкай губерні.

Ды ўсё-такі нуда па родным краі пакутлівым болем свірліла ў ягоным сэрцы. Лісты ад братоў Антося, Петруся, Якуба Коласа, ад бацькоў крыху суцяшалі, прытуплялі гэты боль. Ён падтрымліваў сувязь са знаёмымі настаўнікамі, пісьменнікамі. Працаваў над беларускім пісьменствам, пісаў вершы. Антось атрымаў адкрыты ліст з узорамі беларускага пісьменства XVI—XVII стагоддзяў... Уздыхнуў з палёгкай Язэп, калі дачуўся рэха лютаўскай рэвалюцыі... Выспявала Кастрычніцкая, якую вітаў з надзеяй, што Бацькаўшчыну чакае лепшы лёс.

Вярнуўшыся ў Мінск, Язэп пасяліўся на Старажоўскай вуліцы ў доме пад нумарам адзін. Крыху пазней тут зняў кватэру Якуб Колас, ягоны закадычны сябра Сымон Самахвал (герой кнігі "На ростанях" Янка Тукала). Землякі пакрысе збіраліся ў гурт. Стаўшы старшынёй Усебеларускай Рады, былы пасяленец Сібіры праявіў сябе актыўным палітычным дзеячам. Востра ставіць пытанні на сялянскім з'ездзе: каб Беларусь была незалежнай, мова — дзяржаўнай, а чалавек — свядомым беларусам, культура — нацыянальнай. Ён стаў рэдактарам газеты "Вольная Беларусь", быў членам урада БНР. Да прыходу савецкай улады ён фактычна з'яўляўся арганізатарам Сацыял-дэмакратычнай партыі ў Беларусі і працаваў рэдактарам газет "Звон", "Беларусь". Як сябра Рады БНР падпісаў тэлеграму імператару нямеччыны Вільгельму II, дзе, у прыватнасці, прыватна пісалася: "Рада Беларускае Народнае Рэспублікі, як выбраная прадстаўніца Беларускага Народу, зварочваецца да Вашай Імператарскай Вялікасці з словамі глыбокае падзякі за вызваленне Беларусі нямецкімі войскамі з цяжкага ўціску, чужога пануючага зьдзеку і анархіі..."

(Заканчэнне на 4-ай стар.)

Духоўны скарб

Лёс "крамольніка" з Дворнай вуліцы

(Заканчэнне. Пачатак на 3-яй стар.)

Бальшавікі не даравалі Лёсіку. Як толькі ўсталявалася савецкая ўлада на Бацькаўшчыне, яны арыштавалі вальнадумнага беларуса. У турме дзед крыху адумаўся, пакаяўся перад Саветамі ў тым, што ён не будзе выступаць "против воли народа, коммунистической партии". Гэтак жа лічыць яго хрэснік Лявон Біруля. Брат Антось, які, дарэчы, жыў колькі гадоў у нашай хаце ў Мікалаеўшчыне пад час Айчыннай вайны і пасля, думае інакш: Ігнатоўскі дапамог брату выйсці з турмы, бо ў сваім лісце Язэп пісаў Антосю: "Толькі дзякуючы смеламу Ігнатоўскаму мяне змусілі выпусьціць з астрогу. Ён рашуча хадаваўся за мяне і заявіў: "Калі не вызваліце Лёсіка, дык сажайце мяне..."

Па выхадзе з турмы дзед стаў займацца навуковай і педагагічнай працай. Працуе шмат і плённа. Чытае лекцыі на вышэйшых беларускіх курсах дзяржуніверсітэта. Загадваў імі ў той час ягоны дзядзька Адам Юр'евіч Міцкевіч. Яго лекцыі будзілі свядомасць пачувацца беларусам. Нікому не дараваў глуму над роднай мовай, нават свайму роднаму сыну Юрку, калі той часта карыстаўся словам "да".

— Дык які цябе дурань навучыў гэтаму чужому слову? Трэба гаварыць "так".

Піша граматыку для беларускай мовы школ" і тэхнікумаў. Па словах брата Антося, "Беларуская граматыка для школ" Тарашкевіча была занадта малая і не высвятляла ўсіх фактаў і законаў беларускай мовы".

Як член тэрміналагічнай камісіі быў вельмі актыўным і карысным. Піша прагрáмную кнігу для свайго народа — "Што трэба ведаць кожнаму беларусу". На навуковым узроўні, спецыяльна для тэхнікумаў напісаў працы "Фанетыка", "Марфалогія", "Сінтаксіс". Рэдка якая газета, часопіс абыходзіліся без прамоў, артыкулаў, апавяданняў Язэпа Лёсіка. Энергія ў ім бурліла праз берагі, бо праца шчыра захапіла — душой і сэрцам, можна сказаць, ахвярна служыў свайму народу. Сам ён адчуваў, што яму трэба больш ведаць, асабліва па філалогіі, каб быць на ўзроўні тых, хто меў вышэйшую адукацыю. За пару гадоў, праседжваючы ночы над кнігамі, настырны і валявы дзед вывучыў і прааналізаваў кнігі вядомых не толькі беларускіх, а і расійскіх філолагаў. Самаадукацыя стала кожнадзённай патрэбнасцю.

Пасля рэарганізацыі інстытута Беларускай культуры ў Акадэмію сын мікалаеўскага селяніна стаў адным з першых акадэмікаў на Беларусі. Сябры, калегі па працы па добраму зайздросцілі яго неўтаймаванай напорыстасці, працаздольнасці, ахвярнасці ў дачыненні да роднай Бацькаўшчыны, любасці да матчынай мовы. Прызнаваўся сваім сябрам, пляменніку Кастусю, з якім часта сустракаўся: "Калі я пачую беларускую мову на вуліцах Менска ад людзей у сялянскай вопратцы, то слухаю яе, як музыку".

На Шпітальнай вуліцы Язэп Лёсік меў уласны дом. Непадалёку ад яго на 2-ім Шпітальным завулку збудаваў сабе хату і Якуб Колас. Іх суседзямі былі сям'я Гарэцкіх, Серады, Грамыкаў. Тут збіраліся лепшыя культурныя сілы, шчырыя беларусы, сумленне нацыі, сапраўдныя адраджэнцы. Усіх іх яднала ідэя беларускай нацыі. Нярэдкімі гасцямі ў хаце дзеда былі блізкія па духу і шчырасці Янка Купала, Ігнатоўскі, Ластоўскі, літаратаргісторык Мікола Улашчык, Грамыка, іншыя асветнікі, хто дзяліў мару пра незалежную Беларусь. Жонкі Коласа, Купалы, Лёсіка сябравалі паміж сабою. Як выказваецца ў сваіх успамінах Інна Рытар, "Ванда Лёсік — жанчына рэдкай дабрыні. Сваёй вясёласцю, жвавасцю, пачуццём гумару яна, як Купалава жонка, адразу выклікала сымпатыю... Мо таму гэтыя дзьве мілыя жанчыны вельмі сябравалі. Трое дзяцей Лёсікаў — Юрка, Люцыя й Алеська — хадзілі ў дзіцячы садок, якім кіравала Купаліха — цётка Уладзя..."

Гэтая характарыстыка ў поўнай меры тычылася і Марыі Дзмітраўны, жонкі Коласа. Сябры Якуба Коласа высока цанілі высакароднасць, мацярынскую ласку і тую пяшчоту і гасціннасць, якая прысутна толькі добрым людзям.

Аднойчы да свайго пляменніка зайшоў хмуры, раззлаваны дзядзька Язэп. Сваякі доўга гаманілі ў садку, аб чымсьці спрачаліся...

— Бачыш, браток, што дзеецца на свеце... Ажно моташна на душы. Падзяліўшы нашу Бацькаўшчыну паміж сабою, бальшавіцкая Расея і панская Польшча ўніжаюць нас, як ім хочацца...

— Так, Язэп, з абодвух бакоў ідзе вялікі ўціск на беларуса. Там, на Захадзе, палякі выкарчоўваюць нацыянальную культуру, адбіраюць лепшыя землі ад сялян, аддаюць сваім асаднікам...

— І найгалоўнейша, губяць мову, там фанабэрыстыя паны, а тут свае бальшавіцкія славяне. Паланізацыя і русіфікацыя пайшла ў наступ... Трэба, Костусь, бараніцца. Гусцей высяваць даспелыя зярняты. Нельга сядзець склаўшы рукі. Гукаць паўсюдна, каб не згубіў народ свайго аблічча і выявіў гэта грамадою, не даць, каб рунь была атручанай. Трэба, трэба, братка, не драмаць...

Сваякі закурылі, моўчкі пазіраючы адзін на другога, нібы згадваючы нявыказаныя думкі, тыя балючыя словы, што свідравалі іх сэрцы. Яны ўжо дыханнем адчувалі набліжэнне навальнічнай хмары, якая цёмнай лавінай насоўвалася на вольныя прасторы Бацькаўшчыны... Імперскі чад вітаў у самых высокіх установах. Беларусь губляла сваю годнасць, незалежнасць... Яны ж абодва набліжалі вясну вольнай Беларусі, пакутавалі ў царскіх турмах, змагаліся з дыктатам самадзяржаўя, разам з расейцамі дамагаліся дэмакратычных варункаў для свайго народа, адраджалі, вярталі духоўнасць, спадчыну тых, хто стагоддзямі жыў на зямлі яцвягаў, ліцвінаў, крывічоў, радзімічаў, родных беларусаў... У іхнія сэрцы закралася трывога. Прытушыўшы цыгарку, Якуб Колас уздыхнуў:

— Так, не даюць нам спакою на ідэалагічным фронце... Заўтра будзе гарачы дзень з нашымі апанентамі ў Акадэміі. Дажыліся, дачакаліся часу: мы шкоднікі, нацыяналісты...

— Таўруюць нас асэнтамі польскімі дзеля таго, каб прыпыніць, згасіць адраджэнскі рух, абразіць перад усімі тых змагароў, што чынілі волю вольную мужыку. Толькі навука і культура стала пачувацца ў свеце, дык шыльду прыдумалі: ворагі беларускае навукі!..

— Дык хто ж вораг беларускай культуры, навукі, той духоўнасці, што спадчынай завешча?.. Ці ж гэта не тыя лаўкачы, з вышэйшых палітычных крэслаў. Ім трэба, каб беларус хадзіў прыгнуты і гаварыў, аглядаючыся, — з абурэннем глухаватым голасам уставіў сваю рэпліку Колас.

Язэп з павагай глядзеў на пляменніка, а ў цёмна-карычневых вачах палыхаў агонь. Папраўіўшы акуляры на пародзістым носе, ён падняўся з лаўкі, сказаў сурова:

— Ворагі... Але хто вораг беларускасці? З глузду з'ехалі гэтыя Вальфсоны, Мацюкевічы, Бабровічы, нашы заўзятыя апаненты. Быццам мы з табою не вывучалі працы Леніна па нацыянальным пытанні... Звар'яцелі, дый годзе... Што ім на гэта сказаць?..

Прайшла Акадэмічная канферэнцыя ў 1926 годзе. На вышэйшы сход беларускай культуры і навукі запрасілі філолагаў з Германіі, Польшчы, Латвіі, Літвы... І па змесце і па форме канферэнцыя праходзіла ў чыста нацыянальным каларыце, нават без партрэтаў кіраўнікоў дзяржавы. І даклад камісара асветы Баліцкага быў не ўзгоднены з партыйным ідэалагічным аддзелам. Канферэнцыя мела шырокі водгук за мяжою, а беларускія дзеячы культуры і мовы трапілі пад уціск адпаведных структур. Акадэмічная канферэнцыя выявіла і ўзняла на вышыню нацыянальную духоўнасць, яе культуру, а абаронцы нацыянальнай годнасці трапілі ў няміласць партыі, іх залічылі ў спіс так званых "нацдэмаў". Першым у спісе быў Язэп Лёсік. Сталі сабіраць кампрамат на вядомага асветніка Беларусі. Знайшліся паслугачы цэнтральных органаў партыі, якія з вялікай ахвотаю плявузгалі ў друку, што аўтар беларускай граматыкі, яго сябры псавалі беларускую мову, цураліся карыстацца расейскімі словамі. Называліся прозвішчы Некрашэвіча, Смоліча, Ластоўскага, Цвікевіча, іншых дзеячаў. Супроць іх з'явілася шмат артыкулаў, у якіх ганьбілі "ворагаў народу". Чытачам падсоўвалі інфармацыю, што такія волаты, як народныя песняры Янка Купала, Якуб Колас, Максім Гарэцкі, блізкія па духу з палкімі патрыётамі "нацдэмаўшчыны".

Па ўсёй Беларусі загаласілі газеты, радыё, што Язэп Лёсік — вораг савецкай улады, што ён імкнуўся далучыць Беларусь да Польшчы, а сам намагаўся стаць міністрам асветы пад польскай каронаю. Пайшлі павальныя вобыскі па кватэрах тых дзеячаў, хто быў блізкі з Лёсікам. ГПУ працавала шчыра і груба, "знаходзіла" ўсё тое, што хацелі знайсці, фабрыкавалі факты і самі верылі ў іх, узводзілі паклёпы на людзей, якімі ганарыўся народ. Асабліва шчыравалі ў дачыненні да самога Лёсіка, як выказваўся брат Антось: "З яго пачыналася і з яго і канчалася". Дакаралі дзеда і за тое, што ён ажаніўся з дачкой "кулака" Ядвігіна Ш., бо збудаваў сабе хату і сам марыць, і страдае памкненнямі кулацкімі, па выразе нейкага Валадрынскага. Ён кпіў з Лёсіка за тое, што калісьці чуў, як "яры нацдэм ідэалізаваў кулакоў" і прыводзіць словы дзеда: "Я вельмі жадаю, каб каля хаты кожнага беларуса былі садок і кветнік, а сама хата была добрая, светлая і чыстая". Дык у гэтых прачулых, сардэчных пажаданнях пустаслоў Валадрынскі ўбачыў пагрозу савецкаму ладу жыцця... У 1930 годзе, улетку, Язэп Лёсік быў арыштаваны. Прыходзілі з ГПУ шукаць зброю і да Якуба Коласа. Рабілі нахабны вобыск, паэта ставілі да сцяны з паднятымі рукамі. Выклікалі як сведку па лістападаўскай справе і як блізкага сваяка "галоўнага нацдэма".

"Раскулачылі" сям'ю спадзейнага беларуса, першага настаўніка Янкі Купалы, вядомага пісьменніка Ядвігіна Ш. Невялічкі фальварак, што пад Радашковічамі, разграбілі, адабралі, а сыноў местачковага аптэкара Вацака і Казіка арыштавалі. Гэта былі фактычна дарослыя юнакі: аднаму — 18, а другому — 22 гады. Іх прымусова вывезлі ў Котлас. Там яны, халодныя і галодныя, валілі лес, ірвалі маладыя жылы ад непамернай працы. Там і засталіся. Напомнілі вальнадумнаму і мужнаму Купалу, што сіла "жалезнай рукі" ўсё можа. Маці паэта, ягоных сёстраў таксама "раскулачылі" і ўжо везлі на далёкі Урал, ці той халодны Котлас. Уніжаны Купала бегаў па розных вышэйшых інстанцыях, прасіў, каб вярнулі самую блізкую і святую, пра якую пісаў:

...Люлі, люлі, мой маленькі!
Спі, як кветка напрадвесні,
Як жа вырасцеш вялікім, —
Не забудзься гэтай песні...

З дапамогай свайго сябра Кастуся Міцкевіча ён дастукаўся ў дзверы вышэйшага партыйнага чына. Больш за ўсё на свеце шкадаваў матулю. Яе і сёстраў паэта дагналі Купаліха і Лёсічыха ў Барысаве. Поезд-таварняк не далічыўся траіх пакараных. Бог злітаваўся над роднымі Янкі Купалы.

Язэп Лёсік чакаў суда ў халодную зіму 1931 года. Але гэта не здарылася, не адбылося працэсу над беларускімі дзеячамі. Бальшавікі баяліся галоснасці, непрыемных абаронцаў замежжа, якія б скарысталі гэты працэс. Яны тайком развезлі "ворагаў народа" па розных кутках Саюза, "где вольно дышит человек". Сярод нацыянальных дзеячаў, якіх арыштавалі і судзілі, значыліся прозвішчы лепшых сыноў Беларусі — братоў Максіма і Гаўрылы Гарэцкіх, Некрашэвіча, Адамовіча, прафесара Эпімах-Шыпілы, Красkоўскага, Уладзіміра Дубоўкі, Язэпа Пушчы, іншых. Каля 300 чалавек, гонар нацыі, сумленне народа, яго розум і надзея, пазбавілі бальшавікі права і годнасці людзьмі звацца.

Янка Купала не мог трываць і бачыць гэтай пакуты. Пасля таго, як вярнуўся з ГПУ, ён моўчкі ляжаў, пакутліва шукаючы выйсця. Ягоная жонка Уладзя адчула бяду жаночым сэрцам, пільнавала мужа. І калі ён застагнаў, кінулася да яго... Той ноччу паэт хацеў пакінуць свет, зрабіў спробу вырвацца з маскоўскай няволі. Праз колькі дзён яго адведаў Ігнатоўскі. Са слязамі на вачах прасіў паэта:

— Табе трэба жыць, Янка... Ты ў нас адзін...

Ігнатоўскі суцяшаў Купалу, што надыдзе лепшы час, адродзіцца Беларусь. Але сам не вынес здзеку і пакуты з боку "чырвонага тэрору", застрэліўся... Смерць Ігнатоўскага мела станоўчы вынік для тых, хто чакаў прысуду ў мінскіх турмах. Прыпынілася шальмаванне "здраднікаў Радзімы", перасталі ліць гразь у газетах на "ворагаў народа". Масква была не задаволена стараннямі беларускіх "патрыётаў". Было адпаведнае ўліванне НКУСу... Язэп Лёсік, яго сябры атрымлівалі тэрмін ад трох да пяці гадоў з высылкай за межы Беларусі на вольнае пасяленне і без права вярнуцца ў свой родны край. У горадзе Аткарску Саратаўскай вобласці яму дазволілі выкладаць расейскую мову і літаратуру ў педтэхнікуме. Калі быць шчырым, то і матэрыяльна быў забяспечаны... Ён хадзіў з палкаю, памяць тоўстых мураў НКУСа, дзе каталі, фізічна і маральна ўніжалі годнасць чалавека. Вымагалі, каб падпісаў сфабрыкаваны дакумент, што займаўся контррэвалюцыйнай дзейнасцю, заклікаў народ супроць бальшавіцкай улады, каб лічыў сябе здраднікам беларускага народа... Дзеля праўды, Язэп Лёсік, калі бальшавікі прыйшлі да ўлады, не займаўся палітыкай. Аб гэтым ён не думаў. Ён дбаў пра навуку і культуру Беларусі. Працаваў над падручнікамі па беларускай мове, правапісе. Выкладаў ва універсітэце, чытаў лекцыі на курсах, выступаў у друку. Калі можна так мовіць, быў лагодным да Савецкай улады... Але за тоўстымі мурамі думалі інакш... Ягоны брат Антось пацікавіўся, чаму Язэп падпісаўся перад такім страшным абвінавачваннем, адказ пачуў лаканічны і цвёрды: "Калі б прапанавалі падпісаць сабе смяротны прысуд, я падпісаў бы".

Больш за ўсё дзед пакутаваў ад таго, што ён стаў выгнаннікам са сваёй Радзімы. Нуда па родным краі, нібы шашаль, тачыла яго сілы. Толькі ў сне дакранаўся душою да мілых з дзяцінства мясцін, да Клешчыц каля Нёмана, дзе гукала яго юнацтва... Кожны ранак акідваў арліным позіркам стэпавыя роўнядзі волжскага пейзажу і ў сумных думках пераносіўся да бароў, гаёў шумлівых. Увачавідкі адчуваў гаючую прахалоду хваляў Нёмана, мурожыстую, шаўкавістую траву, што шырокім зялёным дываном слалася абапал ракі. Дубы-вежы, сведкі сівой мінуўшчыны, з магутнымі кронамі ў маляўнічых мясцінах Бервенца, Елава, Лядзін... Перад яго вачыма ўсплывала мілая Мікалаеўшчына, вузкая, цесная Дворная вуліца з падслепаватымі вокнамі і саламянымі стрэхамі. Бацькоўская хата... Яго вочы туманіліся, слёзы капалі на кавыль-траву нуднага пейзажу... Рэдкія прыезды ў Мінск пасля заканчэння тэрміну ссылкі спатольвалі часова смагу яго збалелай душы. Сустракаўся тайком з пляменнікам. Спадзяваўся, што імя Якуба Коласа дапаможа нейкім чынам паўплываць на рашэнне НКУС, дапаможа яму дажыць свой век на радзіме. Таўшчэзныя сцены мура былі халодныя і глухія. Па словах Лявона Бірулі, "Якуб Колас меў вусную вымову ад самога Панамарэнкі, які быццам выказаўся: "Суд Москвы отменить не имеем права..." Словам, нёманскі дуб пачаў вянуць на вачах... Але яму крыху пашчасціла. Калі ўжо страціў надзею вярнуцца на Бацькаўшчыну, крыху дзеду пашанцавала. Выпадак дапамог спаткацца з вучоным філолагам з Бранска. Той дапамог Язэпу Лёсіку папрацаваць у школе ў горадзе Злынка, на мяжы з Беларуссю. Пераехаўшы з сям'ёю сюды, ён часта наведваў Гомель, хапаў асмяжнымі вуснамі гаючы кісларод роднай мовы, якую чуў у тэатры...

Але і гэтую кіслародную вену НКУС перарэзаў навекі. У часы яжоўшчыны аказалася вельмі рызыкоўным ставіць нездавальняючую адзнаку студэнту-камсамольцу. Выкладчык рускай літаратуры Язэп Лёсік у педтэхнікуме парушыў гэтае "залатое правіла" і атрымаў па заслугах. Ілжывы данос у адпаведную структуру зрабіў сваю чорную справу. Выкладчыку нагадалі "былыя грахі" і непавагу да ленінскага камсамола, "сталинских орлят"... Ізноў вярнулі ў Саратаўскую вобласць... На гэты раз у саратаўскую турму. Гэта было ў 1938 годзе...

Смерць майго дзеда пакрыта таямніцаю. Ягоныя дзеці атрымалі асабістыя рэчы бацькі: гнілыя камашы, гадзіннік, папругу ад турэмнага ахоўніка. Дзе пахавалі мужа? Ягоная жонка Ванда Лёсік не даведалася. Па даных Саратаўскага аблвыканкама за № 186/87, ён памёр першага красавіка 1940 года ад туберкулёзу ў турме. Пахаваны ў Саратаве на Васкрасенскіх могілках... Ёсць яшчэ адно меркаванне: Язэпа Лёсіка са звязанымі рукамі бачылі каля вырытай ямы ў цяперашнім парку Чэлюскінцаў. Але ж факт застаецца фактам: апошнія дні жыцця ахвярнага беларуса засталіся неразгаданымі... Яго родныя, жонка здагадваліся, што за сырымі, тоўстымі сценамі турмы гніў муж і бацька, дагарала яркая зорка сінявокай Бацькаўшчыны... Ніхто не чуў апошняга дыхання, не падслухаў яго развітальных слоў. Не аддалі цела нябожчыка жонцы, дзецям, каб па-хрысціянску пахавалі чалавека.

Бальшавікі, з чужой краіны спадары, пайшлі ў наступ супроць беларускай мовы. У 1933 годзе прыдумалі камуністычную рэформу беларускай граматыкі, пастараліся наблізіць яе да расейскай... Без дазволу карэннага насельніцтва, яго ўрада, без дазволу бацькоў (як зараз хапаюцца за гэтую зброю няшчырыя беларусы) пайшла гуляць русіфікацыя па ўсёй рэспубліцы... А тых, сапраўдных абаронцаў нацыянальнай годнасці, слынных сыноў народа, розум і сумленне дзяржавы, партыямі спраўлялі, як той лес, па рэчках. Стойкіх камуністаў не кранала, калі хтосьці ўтапіўся, замёрз, памёр ад голаду. Чалавечы лёс валілі на зямлю, складалі вёрстамі ў шліхты. Такое разуменне, як спагада да чалавечага лёсу, адсутнічала, сталёвае сэрца бальшавіка не рэагавала на чалавечыя эмоцыі, выконваўся план выкарчоўвання нацыянальнай свядомасці, прыналежнасці да свайго роду. Парадаксальна: хто служыў свайму народу — дык той вораг?! А хто ж тыя, як іх назваць, што топчуць, ганьбяць, зневажаюць культуру іншага народа?.. Язэпа Лёсіка рэабілітавалі ажно ў 1988 годзе... Але ці будзе рэабілітацыя тых, хто замучыў бязвінных людзей?.. Хто ім стане суддзёю?..

Не даравалі бальшавікі старэйшаму брату Язэпа Лёсіка Антосю. Яго выслалі з Мінска. Дзякуючы заступніцтву ягонага пляменніка Якуба Коласа, старэйшы Лёсік са сваёю сям'ёю атрымаў дазвол жыць у роднай Мікалаеўшчыне. Дзяржава адмовілася абараніць сацыяльна старога чалавека, хоць ён не адзін дзесятак гадоў служыў дбайна савецкай уладзе, выхоўваючы маладое пакаленне. Дзед Антось быў выдатнейшым матэматыкам. У свой час яму даводзілася адбываць пакаранне за бальшавіцкія ідэі ў адным астрозе з першым народным старастам Міхаілам Калініным. Былая артыстка імператарскага тэатра Уралава стала ягонай жонкай.

У Мікалаеўшчыне Антось Лёсік займаўся прыватнымі ўрокамі. Грошай, якія рэгулярна высылаў Якуб Колас, бракавала, бо артысты, як гаварыў мой бацька, "любілі есьці марцыпаны, не гнуўся нос на зацірку..." Але ж не гэта прыгнятала старога. Яго сістэматычна выклікаў у Стоўбцы "недремлющий" НКУС. Напаміналі, што ён брат Язэпа, жыў і працаваў у Мінску пры немцах... Колас дамогся, каб не трывожылі дзядзьку. Напісаў яму, каб не звяртаў увагі, сядзеў спакойна дома... Працаваць дзеду ў школе не дазволілі. Да самай смерці складаў методыку выкладання матэматыкі ў тэхнікумах. Пісаў кнігу пра брата Язэпа... На пахаванні дзядзькі ў Церабежах у Мікалаеўшчыне Якуб Колас заўважыў:

— Жоўты пясок Церабяжоў не адно пакаленне прыняў мікалаеўцаў. Тут нашы прадзеды, дзяды, бацькі нашы родныя. У вечны свой дом прыехаў і дзядзька Антось... Будзем лічыць, і Язэп тут з вамі навекі... Ён застанецца ў памяці сваіх землякоў назаўсёды, як родны сын, як зямляк нязгасны.

На радзіме Язэпа Лёсіка мясцовая ўлада не прыслухалася да голасу народа. Людзі падпісаліся, каб назваць Казённую вуліцу (зараз яна Школьная) у Мікалаеўшчыне імем свайго слыннага земляка. Дарэчы, школа носіць імя Якуба Коласа. І хораша было б, каб на вуліцы Язэпа Лёсіка гукалі нашчадкі ў школе Якуба Коласа. Дык не... Знайшлі тупіковую вуліцу, якая ўзнікла пасля вайны. Яе ніколі не бачылі ні Язэп Лёсік, ні яго сябры. І далі назоў гэтай вуліцы, з дазволу аблвыканкама, славутаму земляку, аддаўшаму жыццё за вольную Беларусь. А род Лёсікаў пачынаецца з Казённай, князя Мікалая Чорнага Радзівіла паселішча.

Стоп-кадр

Памяць

"З якіх крыніцаў чысціня такая..."

Гэты вершаваны радок Максіма Танка стаўся назвай вечарыны, прысвечанай 85-ым угодкам народнага паэта. У запрашэнні значылася: урачыстасць ладзяць Саюз беларускіх пісьменнікаў ды Беларускі дзяржаўны педагагічны універсітэт, што носіць імя Майстра. Таму, апроч літаратараў-выступоўцаў і двух спевакоў, у праграме вечарыны называліся вядомыя калектывы — народны тэатр "Жывое слова" і фальклорны ансамбль "Ярыца". Абодва акурат належаць гэтай навучальнай установе. Захацелася паслухаць і прамоўцаў, і самадзейных артыстаў. А найперш, зразумела, проста пакланіцца светлай памяці Мастака. І яшчэ, яшчэ... пабыць на вечарынных "развітальных гастролях" у гэтым, бадай, адзіным сталічным асяродку нацыянальнае культуры. Так, так. На "развітальных гастролях". Дом літаратара з 1 снежня перастае з'яўляцца ўласнасцю Саюза пісьменнікаў. Якуб Колас яшчэ, дзякаваць Богу, пранёсся са сваім 115-годдзем. З гэтае нагоды 26 лістапада тут адбылася вечарына.

Большасць залы (студэнты, навучэнцы, школьнікі), пэўна ж, не ведала пра такі "сюрпрыз" вярхоўных уладаў. І таму яе насельнікі былі ў звычайным настраёвым рэжыме. Чакалі цікавага відовішча. Узбадзёрыла публіку "Ярыца". Міла выслухалі вечарынцы "экраннага" паэта (быў паказаны фрагмент з дакументальнага фільма "Максім Танк").

Настрой стаў гаснуць, калі пайшлі выступленні пісьменнікаў. Гаварылася пра цяжкасці сённяшняга жыцця-быцця, пра незайздросны лёс вялікіх людзей.

"Мы не ўмеем ганарыцца сваімі талентамі, хутка забываем іх", — заначыў Іван Шамякін.

"Сумнавата выступаць: забіраюць дом, — пачаў сваю прамову Вячаслаў Рагойша. — Але ж Танк прайшоў і горшыя часы, ды не здаваўся, не вешаў нос..."

Гаварылі пра веліч і непаўторнасць таленту народнага паэта, прамоўцы адзначалі прастату і мудрасць Яўгена Іванавіча ў абыходжанні з людзьмі. "Ён быў вясёлым чалавекам", — чулася ў некаторых прамовах.

А мне ўспаміналася... Максім Танк доўгі час з'яўляўся старшынёю Саюза пісьменнікаў Беларусі. З рознымі клопатамі звярталіся да яго літаратары. Часта бударыжылі і пісьменнікавы ўдовы. Кожная прасіла паспрыяць найлепшым чынам увекавечыць памяць яе мужа. А найперш — назваць яго імем вуліцу ў Мінску. Аднаго разу Яўген Іванавіч, лагодна ўсміхаючыся, сказаў: "Нам з Янкам Брылём і нашым жонкам можна не турбавацца ёсць у Мінску вуліца і Брылеўская, і Танкавая!"

Апроч Івана Шамякіна і Вячаслава Рагойшы на вечарыне выступілі Мікола Аўрамчык, Аляксей Слесарэнка, Васіль Зуёнак(вядучы), Сяргей Законнікаў і Сяргей Панізнік. Між прамоўцамі творы юбіляра гучалі ў чытанні ўдзельнікаў "Жывога слова".

Хочацца аднак вярнуцца да запрашальнага білета. На яго "тэрыторыі" змешчаны два невялікія вершы народнага паэта. Вось адзін з іх:

Аслепшы,
Яшчэ можна з кульбакай
Дарогу дадому знайсці.
Аглухшы,
Яшчэ будзеш чуць
Скрып дзвярэй сваёй хаты.
Анямеўшы,
З сябрамі бяседу вясці
Ва ўспамінах.
Толькі страціўшы Радзіму,
Будзеш, як камень,
Сляпы і глухі, і нямы.

Любіў Радзіму Паэт. А яна яго?..

Радзіма — гэта не толькі родная зямля з яе палямі, лясамі, лугамі, азёрамі і рэкамі. Гэта і людзі. Рознага рангу — высокапастаўленыя і нізкапасаджаныя... Пару пісьменнікаў апроч "загнаных" у выступоўчую абойму знаходзілася ў зале. Не злітаваўся прыйсці на вечарыну ніводзін "аб'ектыўны" дзеяч (фатограф ці апаратар), не кажучы пра тых, хто там, наверсе. А гэта ж — Максім Танк! Колькі гадоў таму ён быў сярод нас — шаноўны і, здаецца, любімы ўсімі... А сёння...

Заявіўшы слова ў загалоўку, хочацца спытаць: "З якіх крыніцаў абыякавасць такая?.."

Алесь МАЛЕВІЧ.

В музыкальной гостиной в Витебске открылась персональная выставка работ художницы Татьяны Березовской. Еще в студенческие годы она увлеклась графикой и до сих пор остается верной карандашу и туши.

На снимках: *Татьяна Березовская; одна из ее работ(слева).*

Фото Александра ХИТРОВА, БелТА.

Трывога!

Дэмаграфічная сітуацыя ў розных рэгіёнах Беларусі пагаршаецца

Бязрадасную статыстыку абнародавала Магілёўскае абласное статыстычнае ўпраўленне: усяго за год натуральнае змяншэнне насельніцтва вобласці павялічылася амаль на тысячу чалавек. На кастрычнік дадзены паказчык склаў 5.487 чалавек, прычым толькі кожны пяты ў гэтым спісе — гараджанін, астатнія — жыхары сельскай мясцовасці. Не стаў мацнейшым на Магілёўшчыне і інстытут сям'і. Хаця колькасць шлюбаў у вобласці за год узрасла на 5,1 працэнта, колькасць скасаванняў шлюбаў перавысіла дадзены паказчык, склаўшы 12,4 працэнта. Такім чынам, калі летась на 100 шлюбаў прыпадала 67 скасаванняў, то ў гэтым годзе суадносіны павялічыліся — 72 скасаванні на сотню шлюбаў.

Не ўнушае аптымізму і дэмаграфічная сітуацыя ў Гродзенскай вобласці. Па даных статыстыкі, за 9 месяцаў гэтага года колькасць насельніцтва ў рэгіёне скарацілася на 4,4 чалавека; паказчык смяротнасці склаў 12,5 тысячы. Паказчык смяротнасці перавысіў узровень нараджальнасці ва ўсіх без выключэння сельскіх раёнах вобласці і ў горадзе Слоніме. Апрача таго, у гэтым годзе за межы Гродзенскай вобласці выехалі 13,5 тысячы чалавек, прыбылі — 13,2 тысячы.

БелаПАН.

Представляем журнал "Здоровье и успех"

Рецепт выписывайте сами

"Бойтесь равнодушных!" — призывает классик. Простые смертные время от времени тоже сетуют на "абыякавасць" ближних. И только одна тема всегда вызывает неподдельный человеческий интерес. Стоит спросить: "Как ваше здоровье?" — и можете быть готовы к подробному детальному отчету.

Но если заболевших обычно интересуют только собственные недуги, то здоровым небезразличен и окружающий их мир. Они ориентированы на активную деятельность и жаждут усовершенствовать все, что, по их мнению, усовершенствованию поддается.

Есть ли что-то способное объединить и занедуживших и благополучных? Есть ли способ, который помог бы первым обрести надежду, а вторым указал кратчайший путь к реализации их идей? Берем на себя смелость утверждать, что есть. И подходит он каждому. Для того чтобы его получить, нет нужды ходить по врачам или записываться на консультации к психологам. Рецепт здоровья и успеха вы выпишете себе сами. Для этого достаточно зайти на почту и оформить подписку на популярный медицинский журнал "Здоровье и успех" (индекс 74909).

С этого момента медицинские светила, подробно объясняющие причины и механизм возникновения самых распространенных заболеваний, лучшие консультанты, авторы наиболее современных методик лечения — у вас дома.

Но вашими гостями станут не только медики. Вместе с героями наших публикаций — людьми, достигшими успеха, вы пройдете их нелегкий путь к вершине, поучитесь на чужих ошибках и, возможно, таким образом сумеете предотвратить собственные. Дамы, изучив рубрику "Галатея", станут еще более обворожительными, их спутники жизни, поучаствовав в "Мужском разговоре", — еще более мужественными. А все вместе — более осведомленными, уверенными в себе и своих способностях. Потому что журнал "Здоровье и успех" рассчитан на каждого, он предназначен для больных, которые хотят быть здоровыми, и для здоровых, которые не хотят болеть.

Обращаем ваше внимание, что для минчан, имеющих возможность приезжать за свежими номерами журнала в редакцию, организована льготная подписка (без стоимости почтовой доставки). Они могут подписаться на наше издание в редакции газеты "Вечерний Минск" по адресу: **г.Минск, пр-т Ф.Скорины, 44, к. 27. Тел. 276-85-00.**

Выпишите свой собственный рецепт здоровья и успеха — и каждый месяц в ваш дом будет приходить достойный вас собеседник.

Светская жизнь

Виктор Вуячич в общественном транспорте ездит бесплатно

Новую социальную рекламу на Белорусском телевидении почитатели разнообразных рекламных телезарисовок встретили искренним удивлением: неужели Виктор Вуячич, народный артист Беларуси, добирается на работу на общественном транспорте и при этом всегда исправно компостирует талончики (или покупает проездной билет на все виды транспорта)? И как вообще объяснить тот неоспоримый факт, что действо, пусть даже и рекламное, происходит в практически полупустом и к тому же сверкающем новеньком автобусе? Не слишком ли наивно и показушно для страны, в которой общественный транспорт в большинстве своем шокирует своим техническим состоянием? А может, Вуячич ездит на личном автобусе? Но тогда при чем тут талончики?!

По словам самого Вуячича, сняться в ролике его заставило глубокое чувство любви к родному городу. Ну и, конечно же, наиблагороднейшая попытка призвать не самую сознательную часть населения нашей республики компостировать талончики. Несмотря ни на что. На вопрос, почему именно его выбрали главным агитатором за небесплатный проезд, Вуячич ответить затруднился.

В принципе, говорит Виктор Лукьянович, работа над роликом была не очень сложной. Отсняли за двое суток. Правда, как утверждает Вуячич, гонорар за ролик ему почему-то не полагается. Одним словом, патриот Виктор Вуячич снимался в социальной рекламе на общественных началах.

Между прочим, сам Виктор Лукьянович постоянно пользуется услугами общественного транспорта. Каждое утро на трамвае или троллейбусе он добирается до своего гаража. А вечером, соответственно, таким же образом возвращается обратно. Однако талончики он никогда не пробивает. И проездной билет никогда не приобретает. И контролеры, как ни странно, его совсем не донимают своими вечными требованиями: "Предъявите Ваш проездной билет!". Как пояснил Виктор Лукьянович, он получает пенсию за особые заслуги. А посему, согласно существующему в Беларуси положению о пенсиях, имеет право бесплатного проезда.

Ульяна Ярмоленка пакуль не пяе. Але мае надзвычай добрыя вакальныя даныя

Не так даўно кіраўнік студыі "Сябры" Анатоль Ярмоленка стаў дзедам. Па словах жонкі Раісы, Анатоль Іванавіч, напэўна, адзіны на Беларусі дзядуля, які разам са сваім сынам Святаславам амаль цэлую ноч у чаканні якіх-небудзь звестак прастаяў пад вокнамі радзільнага дома...

Унучку назвалі Ульянай. Шчаслівыя маладыя бацькі пакуль жывуць разам з бабуляй і дзядулям. Ульяна Ярмоленка пакуль, праўда, не пяе. Але яна, нягледзячы на свой юны ўзрост, па словах бабулі, мае надзвычай добрыя вакальныя даныя.

Марына КОКТЫШ.

Дзень у гісторыі

27 лістапада

У 1754 г. нарадзіўся **Георг Форстэр,** нямецкі філосаф, асветнік, прыродазнаўца і рэвалюцыянер. У 1772—1775 гг. ён удзельнічаў у плаванні знакамітага капітана Кука вакол свету. Падарожнічаў і па Расіі, а ў 1780-х гг. нават жыў і працаваў у Вільні (дзе, дарэчы, вельмі абураўся прыгнётам беларускіх і літоўскіх сялян). Г.Форстэр — адзін са стваральнікаў першай нямецкай дэмакратычнай рэспублікі (Майнцкай камуны на Рэйне).

У 1842 г. у Пецярбургу была ўпершыню выканана опера Міхаіла Глінкі **"Руслан і Людміла"** па казачнай паэме А.С.Пушкіна. У XIX ст. фрагменты гэтай оперы ставіліся і ў нас на Беларусі. Эстэтычныя прынцыпы Глінкі, між іншым, уражэнца Смаленскай губерні, — аптымізм, народнасць, нацыянальная акрэсленасць, высокі прафесіяналізм — прынеслі гэтаму кампазітару сусветную славу.

У гэты ж дзень у 1842 г. нарадзіўся **Пётр Крапоткін,** рускі геолаг, біёлаг, гісторык, літаратуразнаўца і, як і Г.Форстэр, рэвалюцыянер (адзін з тэарэтыкаў анархізму). Ідэал Крапоткіна — федэрацыя свабодных вытворчых суполак. Напісаў кнігу "Узаемадапамога сярод жывёл і людзей як рухавік прагрэсу"... У Мінску ёсць вуліца яго імя.

У 1863 г. на Букавіне нарадзілася ўкраінская пісьменніца **Вольга Кабылянская.** (Цікава, што свае першыя творы яна пачала пісаць на нямецкай мове!) У сваіх творах Кабылянская ўзнімала пытанні чалавечай годнасці, жаночай эмансіпацыі (аповесці "Чалавек", "Царэўна" і інш.).

У 1903 г. нарадзіўся **Піліп Пестрак,** беларускі пісьменнік і ўдзельнік рэвалюцыйнага руху ў Заходняй Беларусі. Кажуць, ён вельмі крыўдзіўся, калі яго прозвішча вымаўлялі з націскам не на першы склад, а на апошні — Пястрак. Напісаў раман "Сустрэнемся на барыкадах", зборнікі апавяданняў і інш. Перакладаў з польскай і ўкраінскай моў. Яго імем таксама названа вуліца ў Мінску.

У 1943 г. пачалася **Ельская аперацыя** войск Чырвонай Арміі сумесна з мясцовымі партызанамі па вызваленні Ельска ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў.

Старонкі храналогіі гартаў Юльян ГРЫГАРОВІЧ.

ТЕЛЕПРОГРАММА

Четверг, 27 ноября

Белорусское телевидение

15.40 Педагогический экран. Роль учителя в реформировании системы образования.
16.10 ТВ — школе. Изобразительное искусство. 3-й класс. Передача настроения в произведениях живописи.
16.30 Родное слово.
17.00 Музыкальный антракт.
17.10 Уроки Н.Новожиловой.
17.45 Экономикст.
17.55 "Музыкальная обойма".
18.00, 00.05 Новости.
18.15 Баскетбол. Международный турнир памяти Владимира Рыженкова. Беларусь — Украина. Девушки. 2-й тайм.
18.50 "Дело по обвинению". Док. фильм "Заказ на убийство".
19.20 Тема дня.
19.40 Сделано в Беларуси. Производственное объединение "Бобруйскмебель".
19.55 "АРТ-клуб". Кинодраматург Федор Конев.
20.30 Музыкальный антракт.
20.40 Колыбельная.
21.00 Панорама.
21.50 Телебарометр.
22.05 "Белые одежды". Худ. фильм. 6-я серия.
23.35 Крок. Программа для молодежи.
00.10 Крок. "Супермодель Беларуси-98". Брестский тур.

ОРТ

08.00 Новости.
08.15 "Роковое наследство". Сериал.
09.00 Человек и закон.
09.40 Пока все дома.
10.15 Домашняя библиотека.
10.25 Телеигра "Эти забавные животные".
11.00 Новости.
14.00 Новости.
14.20 Мультсериал "Невероятные приключения Джонни Квеста".
14.45 "Классная компания".
15.10 Лего-го!
15.35 Сериал "Космическая полиция".
16.05 "...До шестнадцати и старше".
16.30 "100 лет приключений". Сериал.
17.00 Новости.
17.20 "Роковое наследство". Сериал.
18.00 Погода.
18.10 Час пик.
18.30 Телеигра "Эти забавные животные".
19.00 "В поисках утраченного". Ведущий — Г.Скороходов.
19.45 "Спокойной ночи, малыши!".
20.00 Время.
20.40 "Одиссея". Фильм 2-й..
22.35 Сериал "Каскадеры. Мир трюков".
23.05 "Лицо года". Конкурс моделей.
23.30 Новости.
23.45 Программа передач.

Канал "Россия"

06.30, 10.00, 16.00, 19.00, 22.30 Вести.
07.00, 18.00 Дежурная часть.
07.15 Медицинский вестник.
07.20 Бизнес-утро.
07.25 Православный календарь.
07.30, 18.50, 23.05 Прогноз погоды.
07.40 Кроссворд.
08.10 Эксповестник.
08.15 Лучше не бывает.
08.20 Национальный интерес.
08.50 Торговый дом.
08.55 Товары — почтой.
09.05 "Санта-Барбара". Сериал.
13.40 "Фуфель". Худ. фильм.
15.30 Золотая карта России.
16.35 "Чародей". Детский телесериал (Австралия — Польша).
17.30 "Формула 900". Телевизионное автошоу.
18.20 Национальный интерес.
19.25 Подробности.
19.45 "Санта-Барбара". Сериал.
20.45 Сам себе режиссер.
21.25 Добрый вечер.
23.00 Вовремя.
23.10 Кафе "Обломов".
23.50 "Поклонник". Худ. фильм (США).

Культура

07.00 Музыкальный экспромт.
07.15, 13.00, 20.00, 23.00 Новости культуры.
07.30 Сериал "Берлин. Александрплатц".
08.30 "Резцом и кистью". Фрески Мирожского монастыря.
09.00, 11.00, 15.00, 17.00 Новости.
09.05 "Золотая карта России". Об истории и культуре городов России.
09.35 "Кремлевские няньки". Видеофильм.
11.05 "Изобразительное прикладное искусство. Архитектура".
11.30 "Братья Карамазовы". Худ. фильм. 2-я серия.
12.40 Академия спорта.
13.15 "Культура городов мира". Японский калейдоскоп. Курашики.
13.25 "Опасные игры" Камы Гинкаса.
14.05 Посольские вечера (Финляндия).
15.05 "Мир авиации". "Сухой" и палящее солнце пустыни.
15.35 Сериал "Челленджерс".
16.00 "Путешествие во времени". Программа Ю.М.Лотмана.
16.45 Гиперкультура.
17.05 "2003 год". К 300-летию Санкт-Петербурга.
17.10 "Из жизни театрального Петербурга".
18.00 Лукоморье.
18.20 "Красный космос". Фильм 2-й. "С.Королев — трагический герой".
18.50 "Театр одного художника".
19.10 И.Тургенев и П.Виардо.
20.20 Сериал "Берлин. Александрплатц".
21.20 "Тот самый Горин".
22.30 "Кумиры". В.Комиссаржевская.
23.20 Музыкальный экспромт.

НТВ

05.00, 09.00 Сегодня утром.
08.05 Сериал "Крутой Уокер: правосудие по-техасски".
09.15 Телеигра "Пойми меня".
09.45 Мультфильм.
10.00 Сериал "Доктор Куин, женщина-врач".
11.00, 13.00, 15.00 Сегодня днем.
11.20 Старый телевизор.
13.20 Драма "Глашатай чумы" (Италия).
15.20 Программа для детей "Улица Сезам".
15.50 Сериал "Любовь и тайны Сансет Бич" (США).
16.40 Док. сериал "Дикая природа" (Великобритания).
17.10 Впрок.
17.20 Криминал.
17.30 Хоккейный клуб.
18.00, 21.00 Сегодня вечером.
18.40 Герой дня.
19.00 Комедия "Сети зла" (США).
21.35 Футбол. "Динамо" (Киев) — "Эйндховен" (Голландия).
22.30 Сегодняшко.
23.50 Сегодня в полночь.
00.10 Дневник лиги чемпионов. 2-я часть.

ТВ-6 Москва

14.00 ТСН-6.
14.15 Ф.Мкртчян в фильме "Багдасар разводится с женой".
15.35, 00.45 Знак качества.
15.45 Телемагазин. "Спасибо за покупку!"
16.05 Сериал "Флиппер II".
16.35, 18.25 Те Кто.
17.00, 00.00, 01.05 Диск-канал.
17.50 Сериал "Грейс в огне IV".
18.15, 21.20 Новости.
19.00 Сериал "Хроники молодого Индианы Джонса".
20.00 Новости дня.
20.25 Ток-шоу "Сделай шаг".
21.25 Микки Рурк в фильме "Часы отчаяния" (США).
23.30 ТСН-6.
23.45 Дорожный патруль.
01.45 Ночь напролет с Институтом Паблик Рилейшнз.

8-й канал

18.00 Для детей. "Пострелята".
18.30 Программа Кеннета Копланда.
19.00 Сериал "Сирены".
19.45 Новости "К-видео".
20.15 Вечарніца.
20.30 Худ. фильм "Тени исчезают в полдень".
21.30 Музыкальный конвейер.
22.00 Кейт Джексон в фильме "Убийство в колледже".

Адрас рэдакцыі:

220030, Мінск, вул.Энгельса, 34а.
Прыёмная: (017) 229-28-71.
Тэл./факс рэкламнага аддзела: 229-29-04.

Індэкс 63222.

Заснавальнік і галоўны рэдактар Іосіф СЯРЭДЗІЧ

Рэгістрацыйнае пасведчанне №246. Нумар газеты надрукаваны з дыяпазітываў у ПП "Мэджык". Адрас: г. Мінск, вул. В. Харужай, 13. Падпісаны ў друк у 21.00. Фармат А-2. Тыраж: першы завод —50 200 экз. Заказ № 1142